*Уладзімір Гаўрыловіч*



# АГЛЕДЗІНЫ

Апавяданне

*Светлай памяці родных, каго забрала вайна.*

На нач перастала імжэць, знік туман, бралася на марозік. Зашэрхлі лужыны. Зямля ўвачавідкі стыла на холадзе, цвярдзела. Пад поўнач скрозь яе бялеў іней. Такое ж было і неба: бяздоннае, ледзяное.

Домна больш любіла ранкі на перадзім'і: калі ўзнімалася над бярэзнікам за хатамі сонца, светлае, прамяністае, а сцвярдзелая ў грудкі зямля ўвачавідкі чарнела-ажывала ад яго нясмелых дотыкаў, калі сонечная цеплыня выганяе сівы іней, што ўпарта трымаецца ў цяні дрэў і хат, калі неба чыстае і глыбокае.

І чаго ёй толькі не спіцца? Даўно вунь пасопвае Мацей, насвіствае сабе ў нос у пярэдняй. Варочаецца ў ложку Зінка, нявестка. Відаць, таксама перажывае, не можа заснуць. Не, сціхла. Ну, то і добра, хай паспіць. Хай спакойна адпачне і сынок... Хоць і не маладзенькія сын і яго жонка, але ў такія гады шчэ павінна спацца. Рэшта засталася абаім да пяцідзесяці.

Сына вунь паднялі — можна і паспаць. Ёй жа не спіцца, хоць натупалася за дзень не менш нявесткі. Нічога, што так. Яна й рада. Дзякаваць Богу ў свае семдзесят восем яшчэ на нагах, стараецца не кволіцца. Пра хворасць сваю дзецям — ні-ні. Не дай Бог. Ёй грэх скардзіцца, аджывае адведзенае. Не сказаць, што такое і благое. Ладна ў яе сямейцы, усё як у людзей. Нявестка, нібы дачка, ой, харошая жанчына. З сынам — душа ў душу. Не чула крыўдлівых слоў за столькі гадоў. І таемна радавалася, што звёў іх лёс.

Стаяла за адрынай, каля шырокага плоту. Слухала халодную ноч. Праз некалькі крокаў ад будыніны, за разгалістай яблыняй, з якой часта, калі не прыходзіў сон, гутарыла, дзялілася сваім, добра відаць тры ладныя стажкі.

Старая ў думках пахваліла Сеньку, унука. Добры гаспадар расце, не лайдак. Зух! Ніхто яму не трэба ў памочнікі. Толькі схапіў касу — ужо на прыцярэбчыку. Калгаснае ў іх быццам сваё — на рабоце і на рабоце. А пра Лыску — так і атрымліваецца, што яе ды ўнукаў клопат. Домна яшчэ і грэбла з Сенькам, і ў копы складвала. Праўда ж тое, што звозілі мужчыны ў пары. Нябабская гэта справа. Ды і не па яе гадах. Добры ўнук... От толькі шкода старой, што адзіны. Ды на тое прычына — нельга Зіне ды і позна было ражаць. Але ж нічога не папішаш з гэтым. У яе, Домны, таксама адзін Мацейка, волі божай на больш дзетак не было...

Ноч большала, а яна стаяла і стаяла, корпалася ў памяці. Такія і думкі, упоравень яе гадам былі — старэчыя, блыталіся ўпоцемку. Ніяк не хацела даць таму веры — унук уздумаў так раптоўна, знянацку ажаніцца. Мо пажартаваў? Не, якія жарты...

І заўтра, не, мабыць, ужо сёння, бо доўга стаіць Домна на двары, у суботу, па абедзе пазнаёміць з будучай нявесткай і яе сям'ёй. Паедуць няблізка, у вёску амаль за паўтары сотні кіламетраў адгэтуль. Вось табе і дзіця — жэніцца. Эх, час не стрымаць! Што там ні кажы, а гады бяруць сваё...

Усё пасляваеннае наплывала ў яе памяці смуткам даўняй, вялікай, незваротнай страты. Штоноч — то мокрая падушка. Туга не ўціхала і ў клопатны будзень, калі пешшу хадзіла па выкліках да хворых ажно па васьмі вёсках (а гэта больш

сарака кіламетраў), фельчар жа на вёсцы быў што Бог, калі амаль смяротная ўтома валіла з ног. І як хараша, што быў свой куточак, дзе штовечар чакаў маці, прапахлую медыкаментамі, сын. То яшчэ добра ў будзень. У свята — хоць вый. Гора цяжка гаілася, і яна насіла яго пры сабе. А яшчэ маладая была, магла ж выскачыць замуж. Якія толькі мужчыны ў кавалеры ні набіваліся. Не здолела, не захацела. Гады ішлі, прыгажосць знікала, а душа яшчэ ныла. Але не так ужо балюча. Нібы прывыкла да свайго неадлучнага гора. Ды і да векавуцтва. Але — шкадаваць няма чаго...

Зноў — думка пра ўнука. Мацей, сын, таксама вось так — вось як гром з ясная неба — пабраўся. Яна ледзь не страціла прытомнасць ад нечаканай яго навіны: так і так, мама, гэта мая навеста. Хіба ж ты яму скажаш, што Зінка не падабалася ёй? Здалося тады, што супраць волі яе, Домнінай, адбіраюць у маці дзіця, сонейка яснае, выпеставанае, зберажонае — адзінае, дарагое, дадзенае любімым чалавекам. Тым, па кім памяць вярэдзіла душу. І павялічвала боль. Ёй, відаць, не прыйшлася б любая на месцы Зінкі-рыжухі, дзяўчаці суседкі, што расла, як сын, амаль што на яе вачах. Гэта потым прыйшло праясненне. Разуменне, спакой: роўня між людзьмі, калі любоў ёсць і павага. Вось тады і не раз ужо дакарала Домна сябе за гэтую непатрэбную і незразумелую рэўнасць да сына з-за нявесткі.

З той сынавай вясны, калі справіла яму вяселле (а ёй не забыць ніколі: толькі трыццаць хлопцаў і дзяўчат ды два выкладчыкі з сельгасакадэміі на аўтобусе са сталіцы прыехалі. Мацей жа яе быў старастам. Нават і забыўся ў сваім шчасці, што ўсю групу запрасіў. Ёй — не выкрутка, як жа такую прорву накарміць. А яшчэ свае людзі, поўная хата. Нічога, перажыла...), і дзеці вярнуліся на працу ў вёску, за сынавым і нявестчыным шчасцем стала патроху забывацца, сціхаць, зацягвацца яе рана. І хоць недзе далёка ва ўспамінах цьмеў воблік яе Мікалая, з гадамі непрыкметна адыходзіў у нябыт. І ўсё ж — не знікаў. Не мог знікнуць.

Домна, нягледзячы на тое, што шматгадовая пакута па мужу назаўсёды пакінула на сэрцы зарубіну, з таго часу зрабілася бы і весялейшай крыху.

Па-ранейшаму жыла для сына, сынавай — сваёй — сям'і, залежала ад сынавых і нявестчыных перажыванняў. Ніяк жа Зінка не магла зацяжарыць. Гэтае шчасце здарылася толькі праз адзінаццаць гадоў пасля вяселля. Калі і надзеі ніякай не было, і Буйкічы змірыліся з тым, што паслана Усявышнім. Але ён, ужо неспадзеўна, не для Домны, больш для Зінкі, злітаваўся перад хваробай нявесткі — і з'явіўся на свеце жэўжык Сенька. Яна ж, Домна, радавалася больш бацькоў — будзе Яго працяг. Заўважылі сямейцы: раней зацятая, рашучая, цвёрдая, зрабілася мяккая, чулая, падатная...

Плечы пацягнуў начны халадок. Скаланулася. Застаялася доўга, дурніца старая. Лаяла сябе і тым самым адганяла няпрошаныя ўспаміны. Самотнасць, нейкая неўсведамлёная ёй самой трывога, ціхі, цягучы жаль не адыходзілі ад яе чамусьці з самага пачатку гэтай ранняй вясны. І Міколу стала сніць часцей, чым звычайна. Трэба ж такое: вёска ўнукавай нявесты там, недалёка ад мужавай... Думала, каб не вярэдзіць яшчэ больш стомленую душу, не ехаць на гэтыя ці то сваты, ці то проста агледзіны — змовіны. Толькі ж і ўнука пакрыўдзіць — апошняя справа. Не можа. Ён жа гне сваё без перапынку: «Без цябе, бабуля, жаніцца не буду. Ды і Сонька мая пра цябе ўжо больш ведае, чым пра маму і тату...»

Паедзе яна, паедзе. Чаго б там ні было. Не можа адмовіць свайму любімцу. Хоць варушыць старое гэтак балюча...

Яблыня старая, пасляваенная, якую яна прынесла з прыбалатка, ад хвіліннага павеву ветру зашапацела яшчэ неапалымі пачарнелымі лісткамі, здавалася, разумела — спачувала старой. Яна — нібы сяброўка. І Домне крыху палягчэла на душы. Быццам з жывым чалавекам падзялілася сваім...





З ганка пагукала нявестка: «Мамо, дзе вы?! Холадна ж. Ідзіце хуценька до хаты».

Домне пацяплела на сэрцы ад такой да яе ўвагі... Але ж у хаце не магла яшчэ доўга заснуць — не адпускалі трывога і смутак.

Ранкам сонца падружавіла аблокі. Яшчэ ўвечары Сенька з Мацеем наладзілі машыну, вымылі — яна блішчала як новая. Траву заткаў іней. Кожнае слова, сказанае чалавекам на вуліцы, адзывалася ў стылым паветры рэхам.

Усё гэтым ранкам рабілася хутка і весела. Мацей і Зіна ўпраўляліся па гаспадарцы, а Сенька, як звычайна, калі не давалі якой работы бацькі, тоўкся каля бабулі. Так і сёння — дапамагаў чыніць наліснікі. І дураслівa, як бы хаваючыся ад Домны, кідаў адзін за адным у рот. Хлопец быў на дзве галавы вышэй бабулькі, рослы і дужы.

— Смачнезныя, баб... У мамы — не такія...

— Такія ж, такія ж, падхалімажнік ты. Дзіцятка ж яшчэ, а туды ж, жаніцца ўздумаў... — пакпіла з хлопца старая, але тут жа задаволена ўсміхнулася ўнуку: — Цяпер ужо хай табе твая Сонька выгатаўляе прысмакі.

— О, яна ў мяне кухарка на ўсе сто...

Сенька хацеў яшчэ пажартаваць, але бабка перабіла яго.

—А можа, не трэба спяшацца саломіну ў хату весці, га? Ох, дзіцятка, ці не зарань ты бярэшся, вучыцца ж яшчэ абоім.

— Ну, бабка, ты зноў за сваё... — Сенька ад нечаканасці нават пачырванеў.

— Я нічога, унучак... Не думай, што адгаворваю. Хай будзе так, як рашыў. Толькі б не паслізнуўся.

Домна змоўкла, глядзела ў нязыркую печ. Вочы яе патрапілі на слёзы. І ўнук, адчуўшы яе перажыванне, падышоў, ахінуў рукамі бабулю і прашаптаў:

— Баб, ну што ты раскісла? Перастань. Усё будзе а'кей. Ты ж сама казала, што і тата за тыдзень жаніўся. Сонька ведаеш якая харошая.

— Дай жа Божа... Ды, каб знаў, і я замуж выскачыла за твайго дзеда за дні тры без вяселля нават. На другі дзень вайны...

Ашаломлены Сенька застыў на месцы. Нарэшце, ён азваўся:

— Ну ты, баб, даеш. Слухай, а чаго ты мне ніколі пра дзеда не расказвала?

Домна пашкадавала ўжо, што сказала тое, спрабавала ўсміхнуцца і перавесці размову на іншае. Сенька ж не адступаў.

— То ты і не пытаўся ніколі. Дый не час зараз. Ідзі апранайся, пара выязджаць... — і Домна пайшла ў чыстую палову хаты. Неяк затрымцела ўся, вочы выдалі ўнуку яе хваляванне.

Светлавалосы Сенька паціснуў плячыма, падзівіўшыся бабулі, але ўсё ж адстаў — якраз з вуліцы нечага паклікаў бацька.

Хоць малады і пярэчыў, нават усчаў сварку з бацькамі — нічога не браць з сабой, — Домна з Зінай зрабілі па звычаю: везлі і нагатаванага, і горка-пякучага. Як жа інакш, што людзі падумаюць! Не, як прымуць нашае, так і пагодзімся, нельга ж з пустымі рукамі ехаць. Да таго ж гэтыя агледзіны могуць стаць заадно — і сватамі. Што ж часта ездзіць, калі маладыя ўсё самі вырашылі.

... Ехалі моўчкі. Чым больш ад сонца ажывала зямля, усё менш і менш заставалася спакою на душы ў Домны: праз цэлае жыццё яна вярталася ў маладосць.

Ледзь толькі мінулі бярэзнічак за мястэчкам — патрапілі ў чыстае поле. Па даху аўтамабіля хадзіў вецер. Шчэ халодны. За полем дарога зноў увайшла ў дрымотную цішыню лесу.

Першай у дарозе азвалася Зінка, якая сядзела поруч са свякрухай на заднім сядзенні, прыбраная ў пуховую кофту і сінюю спадніцу з крэпдэшыну. Домна падумала: нявестка ў гадах, а яшчэ як тая дзяўчынка! Не пачула якраз, што з заклапочанасцю, ледзь не са спалохам казала Зіна.

— Я ж, мамо, ручніка не ўзяла, перавязаць сватоў трэба будзе. Дый абраз хай бы ляжаў у машыне...

Сенька ледзь не выпусціў з рук руль, пырснуў смехам. Не стрымаўся і Мацей, зарагатаў:

— Што ты, жонка, надумалася. Мы ж знаёміцца толькі едзем... Ну, даеш... яго разбірала ўсё. — Глядзі, вунь і наш студэнт-жаніх са смеху зараз памрэ. Забабоны вашы...

Сына падтрымала і Домна.

— Ручнікі то зараз і сапраўды без патрэбы, калі б у сваты — то сватоў чаго не ўзялі? А вось абраз хай бы быў. Сёння вунь як да веры кінуліся, і начальства нават паклоны адбівае...

Сенька вырульваў да мяжы суседняга раёна, ужо забыўшыся на мамін успамін пра ручнікі, расказваў анекдоты са сталічнага жыцця, распавядаў пра сваіх сяброў. Бацькі гучна смяяліся. Домна ж — не чула ўжо ўнука.

Чаго баялася — здарылася: думкі нахапіліся ўспамінамі. І ёй рабілася горка і адзінока яшчэ з большай сілай, калі лес выпусціў машыну каля першых хат раённага цэнтра. І яна, затуліўшыся, хавала слёзы.

Калі ўжо далей, недзе ў цэнтры, праязджалі праз горад, раптам апусцелую ад болю і пацішэлую Домніну душу напоўніла здзіўленне: як неспадзеўна ўсё змянілася?.. Гэта быў не той гарадок, што застаўся ў памяці і часта сніўся. Тут амаль нічога не засталося ад таго, што было раней, у часы яе маладосці... Каляровыя гмахі дамоў, двух- і трохпавярховак занялі яе ўвагу.

Краем вока шукала старую бальніцу. Не, там, на тым месцы, дзе яна павінна быць, — таксама новыя дамы. Дзе ж яна, старая бальнічка? Колькі ні прабягала вачыма — не знаходзіла яе.

...Яна толькі трэці дзень працавала, а яго, Міколу, выпісвалі з бальніцы пасля запалення лёгкіх. Купаўся, дык застудзіўся. Яны моцна стукнуліся лбамі на лесвіцы, на пераходзе бальніцы. Так і пазнаёміліся. А яшчэ праз тры дні — вайна. Ён знайшоў яе на кватэры: «Запала ў сэрца, не магу жыць без цябе. Хоць вайна, давай пажэнімся...» Распісаліся, толькі спазналі адно аднаго...

Чым бліжэй да чыгуначнага пераезда — тым больш навальваліся ўспаміны. Ведала гэта беспамылкова — зараз ён будзе, той чыгуначны пераезд. Так і ёсць. І каб не хваляваць дзяцей, адвярнулася, заплюшчыла вочы. Сэрца сцялася: недзе тут — ён. Ужо ніхто не скажа — дзе...

Кола трапіла ў выбоіну. Сенька буркнуў зласліва на дарожнікаў. Запаліў цыгарку Мацей. Горад застаўся ззаду. Як нечакана пачаўся, так і закончыўся. І, здавалася, выпусціў са сваіх абдымкаў і ўспамінаў Домну.

Зноў пачаўся лес, колы аўтамабіля каціліся па доўгай і шырокай дарозе.

Домна ціха радавалася, што не азмрочыла свята ўнука, не разраўлася, не спалохала дзяцей сваёй даўняй таямніцай, сваім, яна лічыла яго толькі сваім, горам. Усё, што было, яму нішто не пашкодзіла закончыць акадэмію, мець добрую пасаду. Ну, і хай жыве шчасліва. Не ведае нічога, то й добра. Хіба ж яна змагла б даказаць, што яго бацька — не вораг, хіба ж яна магла што-небудзь змяніць? Не, усю праўду яна пакіне для сябе, толькі ёй яна належыць.

Астатнія паўгадзіны ехалі моўчкі... Домна нібы ні з таго ні з сяго адчула стому. Нахлынулі ўспаміны, а ёй так захацелася перадышкі ад іх.





...Соня — больш пайшла па бацьку. Такая ж бялявая, аднаго колеру з ім — ранняга васілька — вочы. За сталом сядзела неяк па-дзіцячы разгубленая, часам хмурая — задуменная. Затое ж жытам шапацеў, бы яго паднавілі, іх Сенька. Толькі ён здымаў напружанне, што панавала за сталом. А пасля, як падпілі, то дружна загаманілі ўсе. І Сенька ўжо нават паспеў паспрачацца пра сучасную моладзь з бацькам, са сваім будучым цесцем — невысокім, хударлявым, намнога маладзейшым за Мацея, Сцяпанам. За сталом была толькі блізкая Сцяпанава радня: Маруся, Соніна маці, была з другой, недалёкай вёскі.

Хутка зашчабяталі між сабой мацяркі, паспелі нават некалькі разоў пацалавацца. Домну радавала, што сваты людзі простыя, хлебасольныя. Мужчыны ёсць мужчыны — ад вялікай палітыкі хутка пераключыліся на калгас і мясцовую ўладу. Домна ж больш углядалася на ўнукаў, якія то з'яўляліся ў хаце, то зноў знікалі на вуліцы: справа ж маладая. Дзяўчына ёй спадабалася — да пары Сеньку, быццам бы і падобныя яны чымсьці.

Доўга сядзець за сталом не магла. І гэтай гадзіны хапіла, каб разбалелася галава, бо прымусілі прыгубіць пякучкі-самагонкі. Таму ціхенька, каб не заўважылі, выйшла з хаты, патупала па двары.

Сівізной бялела павуціннеў аціхлым у восеньскіх мроях садзе. Раптам знікла, схавалася за хмару сонца, пацягнула прахаладай. Праз хвіліну, сабраўшыся з апошнімі высілкамі, яно зноў аблашчыла зямлю кволай цеплынёй.

Домна прысела на дубовую лаву ў садзе каля калодзежа, пазелянелую ад веку. Некуды адышоў, знік пакутлівы боль. На хвіліну, на імгненне. Пазірала на блізкі — рукой падаць — лес, углядалася ў вяршыні яблынь і груш. Дрэвы давалі ёй дыханне, сілы жыць, яны і зараз супакойвалі, суцяшалі, гаілі боль.

Зноў тузанула-рэзанула сэрца. Домна зморшчылася, каб не застагнаць. Не дай Бог пачуе хто! Не, адступіла, адпусціла. Адразу палягчэла. Здалося, бы заснула. І нібыта зноў ішла па амаль аголеным лесе, змызняку, слухаючы, як шархаціць пад нагамі апалае лісце...

Што яна робіць? Навошта, бяздумная, соваецца па гэтым чужым лесе, адна, пакінутая Міколам тут, у Дзерніцах, яшчэ больш двух месяцаў назад, у гэтых незнаёмых мясцінах? Недзе ўнутры яе толькі зарадзілася жыццё, пра якое муж яшчэ не ведае. Не ведала пра гэта і яна да ўчарашняга дня. Цётка Алеся, выпраўляючы з хаты, толькі зірнула на яе і растлумачыла — чаму яна раптоўна захварэла. Паставіла трапны «дыягназ»: «Ты ж беражы дзіця». Як бы яна хацела сказаць пра гэта мужу.

Яна ішла і ішла, не ведаючы куды. Пакутлівая разгубленасць: што рабіць, куды падацца, у які бок кіравацца, каб выйсці да райцэнтра, а потым па чыгунцы — ды ў родныя мясціны, бліжэй да Рэчыцы?

Мікола за апошнія месяцы прыходзіў у вёску разы тры. Затрымліваўся ненадоўга. Цётка ўсё разумела, знікала з хаты. Учора ён пагрукаў на золаку. Стомлены, аброслы, счарнелы, вочы налітыя страхам. «Бяда, — кажа, — пра цябе ўведалі паліцаі. Лесам дабірайся дадому. Бо з жонкамі камуністаў не цацкаюцца, павесяць. А я ж які ні ёсць — кіраўнік раёна. Ды і каб цётку не спалілі. Са мной нельга, мы збіраемся прабрацца на фронт. Не атрымаецца — да партызанаў. Чакай мяне, сонейка, мы яшчэ сустрэнемся...» Слёзы, пацалунак — Мікола пайшоў. Цётка загаласіла, але тут жа сціхла і закамандавала: «Чула, што пляменнік казаў? Збірайся хутко!..» — «Можа, заўтра? Я не ведаю, куды ісці». — «Я выведу да лесу. Ідзі паўз дарогу, толькі каб гэтыя гады не заўважылі. Надвячоркам будзеш у райцэнтры, а там — Бог і людзі...»

Пайшла ў чым была, толькі фуфайку ўскінула на плечы. Цётка загадала гэтак: «У сялянскім прымуць за сваю, мястэчковую, калі што, а гарадскую вопратку закапаю ў садзе, не прападзе...»

Цётка правяла да зарасніку, пацалавала тройчы і пайшла, ні разу не азірнуўшыся.

За дзень прайшла нямала. Як і раіла мужава цётка, ішла метраў трыста ад насыпу дарогі. Добра, што пакуль было суха. К вечару ўжо ледзьве перасоўвала ногі, выбілася з сіл. Навальваўся, як сцяна, сон. Рабіла перадышкі, але кароткія. Стаяла, сесці баялася — засне. Недзе збоку нарэшце пачула, як прайшоў цягнік. Значыць, хутка горад.

Клаўся змрок. Адышоўшы яшчэ трохі, звалілася на халодную траву. Змораная, спалоханая і спустошаная, нейкі час сядзела пад сасной. Слёзы — жаночая завядзёнка, — як ні стрымлівала іх, набеглі на вочы. Звялая, кранутая пазімкам трава прыняла яе ціхае роспачнае рыданне. Але ж гэта не збавенне: трэба ісці, ісці...

Прабралася праз гушчар, можа, яшчэ з паўкіламетра, як пачула, што па дарозе нехта едзе: бразгаюць калёсы, даносяцца галасы. Прыгінаючыся, хацела прабрацца да шляху, каб пабачыць: вяскоўцы ці паліцыянты? Спазнілася, праехалі. На дарозе нікога.

Подбегам кінулася лесам услед. Нарэшце наблізілася да дарогі як толькі магла, каб быць незаўважанай. Разгарнула кустоўе і ледзь носам у нос не стрэлася з паліцыянтамі. Легла, сцішылася ў хмызняку. Адчуванне бяды, вялікай, як свет, сціснула горла.

Угледзелася: чацвёра паліцыянтаў некага везлі на калёсах. Абмерла. Якраз супраць хмызняку калёсы спыніліся. Двое засталіся каля калёс, двое ішлі сюды, да лагчынкі. Яна пахаладзела: няўжо заўважылі? Не, збочылі крыху. Адзін паліцай. Другі цывільны — у новай фуфайцы, рыжы нейкі. Худы, як слуп. Спыніліся. Яна адвярнулася: тыя спраўлялі сваю патрэбу. Пайшлі назад, рушылі далей за калёсамі... Угледзець, хто быў на возе, — яна не магла, усё ж далекавата. Трэба падабрацца бліжэй...

Падалася назад, у глыб лесу, і што ёсць сілы пабегла наперад. Пакуль не ўцямнела, падышла бліжэй, схавалася ў ельніку, прыгледзелася. Перасохла ў роце, закалацілася ўсё ўнутры: то ж быў яе Мікола...

Сэрца не падманула, не дарэмна бегла. Толькі што зменіш — яна ж не вызваліць мужа. Вырашыла ісці следам за імі да горада. Хоць будзе ведаць, што ён жывы...

Яна прыгледзелася да паліцыянтаў. Ведала з іх толькі аднаго. Звалі Шэры, значыць Сяргей. Успомніла: гэта ж ён неяк пытаўся ў цёткі: што за кватарантка з'явілася. Ці не жонка «райкомаўца»? Цётка тады сказала, што з-пад Брэста прыехала, пляменніцы дачка, ды так і засталася — вайна ж... Адчапіўся. Так цётка ўсім казала. Верылі. Але ж, відаць, нехта ўсё ж данёс, што яна Буйкіча жонка. Адкуль толькі Мікола ўведаў, што паспеў папярэдзіць?.. Трое, што ішлі за калёсамі, вызначыла, мелі адносіны да паліцыі: на руках павязкі. І зброя ў іх. Рыжы ішоў так, без нічога. Прыгледзелася яшчэ раз: не, нікога не бачыла раней, апрача Шэрага. Ён, відаць, за старшага.

Пад'ехалі зусім блізка — яна, здаецца, сустрэлася вачыма з Міколам, ён нешта насвістваў ці спяваў. Каб не збег, звязалі вяроўчынай рукі і ногі. Божа, а ён яшчэ нешта спявае!

Шэры тыцнуў руляй вінтоўкі Міколу ў твар — яна аж сцялася ад болю.





— Змоўч, камуняцкая сука. А не, зараз — на месцы...

— Чаго ж доўга чакаць, прадажнік? — ледзь прашаптаў Мікола і атрымаў яшчэ адзін страшэнны ўдар у плячо.

— Бі, жывёла... Табе гэта залічыцца.

— Маўчаць!!! — злосны крык паліцая рэхам азваўся ў паветры.

Домна сядзела ў ельніку і глытала слёзы: што ж гэта будзе? Не заўважыла, як спераду паказаліся яшчэ адны калёсы. Паліцаі, а іх было двое, спынілі каня і чакалі, калі калёсы з палонным параўняюцца з імі. Домна праціснулася праз гушчар ельніку крокаў на трыццаць і зразумела: там паваротка, вось чаму паліцаі спыніліся. Было далекавата, але яна бачыла ўсё, што адбывалася на шляху.

Шэры падбег і нешта далажыў аднаму з паліцаяў. Той, расставіўшы ногі, грузна стаяў пасярод дарогі. Выслухаўшы паліцыянта, падышоў да калёс, за плячо штурхнуў Міколу (Божа, ён быў увесь у крыві!) і штосьці загадаў. Вярнуўся назад, узгрузіўся на калёсы, побач з маладзенькім паліцыянтам.

Паехалі па лясной сцяжыне далей. Было відаць, што Шэры чымсьці разгублены. Падышоў да сваіх, нешта сказаў. Рыжы зароў на ўсё горла: «Не буду, лепш дадому!..»

Домна хуценька прабралася бліжэй, наколькі магла схавацца ў ельніку. Пачула, як сварацца: «Чаго мы, няхай немцы. Мы ж затрымалі...»

Шэры ядавіта ўсміхнуўся і плюнуў. Нарэшце сказаў:

— Зробім гэтак: у нас і так хапае такіх... — Чмыхнуў, грэбліва глянуўшы на Рыжага: — А для цябе, Свірыдзёнак, гэта — шлях у паліцыю. Так сказаць, экзамен. Як у савецкай школе: здасі экзамен — возьме на службу начальнік паліцыі. Не здасі — самога на мушку. Так што...

Рыжы, яна добра яго бачыла, амаль юнак, затросся, штосьці ціха — Домна не пачула — адказаў. Ён адвярнуўся ад паліцаяў, ступіў крокаў пяць назад, да лесу. Яна добра бачыла, як сутаргава хадзілі скулы на яго твары, ажно выступіў пот.

— Хлопцы, мо хто з вас за мяне стрэльне, мне страшна... — Рыжы вярнуўся да калёс. Паліцаі маўчалі.

Не вытрымаў Мікола, скупа ўсміхнуўся:

— Страляй, шчанё. Пахваляць: камуніста забіў...

— Змоўч, сука!.. — Шэры зноў прыкладам вінтоўкі ўдарыў па спіне Міколу, цыркнуў слінай праз зубы, загадаў: — Выконвай загад! — І сунуў Свірыдзёнку вінтоўку.

Домна абвяла, упала ніц. Вочы нібы нічога не бачылі, яна быццам нічога не чула.. Апрытомнела, кінула позіркам на прагаліну. Горла перацiснула — стрэл...

Дзіўна, але яна ўжо не плакала, не пяклі слёзы. Бачыла, як Свірыдзёнак кінуў вінтоўку і, злосна мацюкаючыся, пабег па дарозе назад. Паліцаі зарагаталі яму ўслед: — Бяжы, бяжы... Заўтра прыйдзеш, цяпер ты — наш... Шэры, як быццам рабіў гэта кожны дзень, спакойна загадаў укінуць цела Мікалая ў калёсы. Потым плюнуў, паведаміў:

— Абадоўскі загадаў далажыць, што Буйкіч сам здаўся.

— Якая розніца? — здзівіліся паліцаі.

— Ёлупні... Калі сам здаўся райкомавец — знаць улада нямецкая моцная, саветы не вернуцца...

І паехалі.

Домна зайшлася ў страшным, несуцешным рыданні...

...Домна ачуняла, але сэрца яшчэ крыху ныла. Здалося старой, што не сон то быў, а сустрэча з маладосцю.

Пра мужа ў вёсцы, апрача яе бацькі, які нядоўга пажыў на гэтым свеце, ніхто не ведаў. Калі пыталіся, адказ просты — загінуў недзе на вайне. Бяда ж у кожнай хаце прымасцілася ў чырвоным куце, толькі хіба з адной розніцай: жанчыны — чакалі сваіх, яна — не. Дый жаночая доля — не дзявочая.

Нарадзіўся сын, за клопатамі боль страты пастулова прытупляўся, хоць, канечне, нічога не забывалася. Дом, гаспадарка, праца і дзень і ноч, недахоп медработнікаў, сын... Жанчыны здзіўляліся: чаму не афармляе Буйкічыха льгот як удава. А яна пра гэта не думала нават, дый ніхто асабліва не цікавіўся яе мужам. Як і не было яго зусім. Але ў сорак восьмым не вытрымала, напісала ліст мужавай цётцы. Спадзявалася, што выжыла ў вайну старая. Пацікавілася, што казалі ў вёсцы пра мужа, як загінуў. Пра сваё — ні слова. Дый не назвалася спецыяльна ў тым лісце, што яна Міколава жонка, а так, знаёмая...

У Дзерніцах лісту здзівіліся: згарэла старая Буйкічыха ў адрыне з суседзямі... З пошты пісьмо перадалі ў сельсавет. Старшыня, былы каўпакавец, напісаў тое, чаго і баялася: «Былы камуніст Буйкіч сапраўды хаваўся з групай таварышаў у лесе, а аднойчы, адлучыўшыся да радні ў бліжэйшую вёску, здаўся паліцыі і хацеў раскрыць месца дыслакацыі групы партыйных работнікаў. У час следавання ў райцэнтр паліцэйскі абоз захапілі партызаны і расстралялі здрадніка. Паліцыянты закапалі свайго хаўрусніка недалёка ад чыгуначнага пераезда. Дзе канкрэтна — наўрад хто можа зараз паведаміць...»

Тая зжаўцелая паперка — бы прыгавор...

Старая дзівілася свайму сённяшняму настрою. Трэба радавацца ўнукаву шчасцю, а яна ўспамінае тое, што хавала ўнутры сябе столькі гадоў. А можа, і варта расказаць — нічога ўжо ж, здаецца, не перашкаджае таму, каб дзеці ведалі праўду, такую, якая яна ёсць — пра іх бацьку і дзеда? Якую яна ведае, а не людзі. І чаму ж сёння, у дзень заручын унука Мікалая, ім не раскрыць усё, што хавала ўсе гады? І што за дзесятак кіламетраў адгэтуль — рукой падаць, вёска, радзіма Мацвеевага бацькі, Сенькавага дзядулі? Дзе яна, маладзенькае дзяўчо, хавалася ад вайны ў бацькавай і дзядулінай цёткі?.. Не, лепш потым, пасля.

Яна прымусіла сябе ўстаць з услона. Усхваляваная сваімі думкамі, паціху дайшла па счарнелым лісці да канца вялікага саду. Здалёк не пачула, як клікалі яе ў хату. Адсюль, як намаляваная на лісце паперы, была відаць частка вёскі, хат на сорак, не больш. Цагляных хат мала, больш драўляных, старыя суседнічаюць з навейшымі. Хаткі, раскіданыя паўкругам, утвараюць у цэнтры добры выганпрагаліну. Пры кожным двары і вуліцы доўгімі шнурамі складзены дровы. Яна не дзівілася гэтаму, хоць і лічыла такое вялікім непарадкам. Ведала, што ў Дзерніцах таксама яшчэ і да вайны ніхто не хаваў дровы ў двор, пад павець. Зямлі тут удосталь, вуліцы — не цэнтральныя, прывыклі людзі гэтак...

Домне не ўдалося дадумаць сваё: пачула ўсё ж, што яе кліча Сенька, і вярталася да хаты ціхая, спакойная... Унукі — ужо не падзяляла іх, зараз як быццам былі ўжо адным цэлым для яе — чакалі каля калодзежа. Смяяліся, свяціліся шчасцем і каханнем. І Домна шчыра парадавалася за іх.

Сенька паўшчуваў бабулю:

— Ты, баб, не ўседзіш на месцы. Мабыць, ужо гаспадарку вывучыла лепш, чым зяць. Якія ж вывады: з пасагам нявеста ці так сабе?

Домна, добра ведаючы ўнукавы шпількі, адказвала тым жа:

— А што? Трэба да ўсяго прыглядзецца, каб не памыліцца, ведама ж, які скарб тваёй Соньцы на рукі перападзе. Каб толькі яна справілася з такім вось языкатым, каб не прыйшлося назад нам такое дабро вяртаць...





Смяяліся ўсе ад душы. Сенька, жартуючы, пакрыўдзіўся:

— Я ж думаў, што бабка мяне будзе толькі і расхвальваць сватам, а тут, выходзіць, нічога не варты...

У хаце людзей большала, было весела, тлумна. Малады незнаёмы музыкант не даваў спакою гармоніку. Не звярталі ўвагі на песні і музыку, штосьці па-ранейшаму даказвалі адзін аднаму мужчыны-сваты. Расчырванелася гаспадыня, што не адыходзіла ад Зінкі, убачыўшы Домну, сказала музыку:

— Пагодзь, Віця!.. Гэта ж наша галоўная сваццця ў хаце, бабуля Сені.

Маруся ўжо была на добрым падпітку, пачала даводзіць Домне хто ёсць хто:

— Гэта ж мой бацька і брат з жонкай прыехалі. Блізка тут жывуць, у суседняй вёсцы. Сонька збегала да суседзяў, патэлефанавала. Бацька ў нас — партызан, заслужаны чалавек, яму ж тэлефон правялі. «Запарожац» свой ёсцека, без чаргі, бясплатна далі як інваліду, таму хутка сабраліся з Дзерніц на маладога і радню яго паглядзець!..

Куды падзеўся той спакой — Домну кінула ў холад, ажно затрэсла, як асінку ў полі: яны адтуль, з Дзерніц. Але стрымала сябе, не хацела паказваць хваляванне, схавала яго ад чужых вачэй. Павіталася з доўгім, як бэлька, братам-музыкам, пацалавалася з яго жонкай Анютай — маленькай і поўнай маладзіцай.

Разам з нявесткай прывітаць сваццю ўзняўся з-за стала такі ж, як і сын, высокі, яшчэ моцны дзядок. Паўнатвары, з сівымі скронямі, у старым кортавым пінжачку і цёплай байкавай сарочцы, відаць, адных з Домнай гадоў. Стары штосьці азваўся. Што ён сказаў — яна не магла ў гэтым гармідары разабраць. Таму проста працягнула руку свату ў тут жа сустрэлася з ім вачыма, тварам у твар...

Яна ледзь знайшла сілы, каб паціснуць руку старога. Скамянела. Не магла да самага вечара вымавіць ні слова. І чым больш разгаралася-гуло застолле, тым больш крычала, аблівалася слязамі, білася роспачным рыданнем яе душа, а сэрца не магло вытрымаць такога: за сталом насупраць яе сядзеў стары рыжы Свірыдзёнак — той самы загубца яе мужа, Мацеевага бацькі, Сенькавага дзеда...



*Уладзімір Гаўрыловіч*

# НА ЗЯМЛІ ДРЫГАВІЧОЎ

Урывак з дакументальнай аповесці

## ЯКІ ТЫ, СУЧАСНЫ ТУРАЎ?

У Тураве нават малое дзіця, калі пацікавіцеся, што ведае пра свой Тураў, «адтарабаніць» як «ойча наш»: «Горад наш старэй, мабыць, і Кіева! Але летапісы згарэлі! Ну, але што зробіш, трэба хоць з тысячагадовай гісторыяй мірыцца!..»

Той, хто раней чуў пра легендарны Тураў і ўпершыню трапляе сюды, спадзяецца ўбачыць тут старажытныя збудаванні замкаў, сцен, вежы з байніцамі, шматлікія царкоўныя купалы... Але яго чакае расчараванне. З прыкметамі мінуўшчыны Тураву надта не пашанцавала. Гэты гарадок, відаць, найбольш сярод іншых старажытных гарадоў пацярпеў за мінулыя вякі. Цяжка нават злічыць, колькі разоў ён гарэў і знішчаўся.

Так, сённяшні Тураў – вяскова-гарадскі. Тут суседнічаюць разнастайныя драўляныя будынкі і мураваныя шматпавярхоўкі, пабудаваныя за апошнія дватры дзесяцігоддзі. Звычайна, першае з уражанняў тых, хто яго наведвае, гучыць заўвага, што патрапілі ў «проста вялікую вёску». Пасля госці зразумеюць, што памыліліся, і іх вызначэнне ніяк не падыходзіць да Турава. Адмовіцца ад папярэдняй думкі іх заставіць многае. І найперш — сама культурна-прыродна-гістарычная аўра, якой напоўнены гарадок, і — не без патрыярхальнасці — уклад тутэйшага жыцця. Спецыялісты ж вось што сцвярджаюць: не, гэта не вёска! Уся справа ў тым, што амаль менавіта так і выглядалі старажытныя гарады ў самую пачатковую пару іх гісторыі. Неверагодна, але факт: скрозь стагоддзі Тураў захаваў у многіх сваіх рысах аблічча першых славянскіх гарадоў, і ў гэтым яго незвычайнасць, прыцягальнасць. Пабываўшы тут, у гэтым ціхім, утульным, крыху казачна-сучасным вяскова-гарадскім паселішчы, мала хто, ад'язджаючы, не скажа: «Дык гэта ж – наша беларуская Палесціна! Менавіта тут сапраўдная соль зямлі беларускай, і яе трэба берагчы такой, як ёсць!..» І гэтыя людзі маюць рацыю.

Але вернемся да сённяшніх дзён. Першым крокам да аднаўлення былой славы Турава з'явілася тое, што ў 2004 годзе Прэзідэнт Беларусі вярнуў тураўлянам статус горада. Так што сёння старажытны Тураў – юрыдычна сапраўдны горад! Гэты музей пад адкрытым небам — цэнтр гарадскога Савета раённага падпарадкавання, у састаў якога яшчэ ўваходзіць невялічкая вёска Крэмнае. Насельніцтва крыху больш трох тысяч чалавек. Працаздольных і дзяцей – 60 працэнтаў, астатнія — пенсіянеры, аб'яднаныя, дарэчы, у моцную ветэранскую арганізацыю. У год тут нараджаецца болей 30 дзетак. На тэрыторыі Тураўскага гарсавета крыху больш 40 прадпрыемстваў, аб'ектаў сацыяльна-культурнага, бытавога абслугоўвання насельніцтва.

Тураў — горад у большай ступені аграрны, чым прамысловы. Увогуле, Тураўшчына – вельмі старажытны сельскагаспадарчы рэгіён. Традыцыі земляробства тут бяруць карані з эпохі Кіеўскай Русі, калі яшчэ не раней. Таму зямля гэта нараджала не толькі мужных воінаў. Прайшлі стагоддзі, і даўно палі былых бітваў сталі палямі змагання за высокія ўраджаі.

Так, надзвычай высокімі дасягненнямі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці славіўся ў савецкі час тураўскі калгас «Новае жыццё». Ён і да Вялікай Айчыннай вайны лічыўся адным з перадавых у рэспубліцы. 22 цэнтне-

ры на круг – такі атрымлівалі тады ўраджай у сельгасарцелі. У 70-80 гады XX стагоддзя ўжо пераўзыдзены рубеж у 50 цэнтнераў зерневых з гектара ўборачнай плошчы, 380 – бульбы. Невыпадкова гаспадарка мяса-малочнага профілю з развітай вытворчасцю збожжа прызнавалася флагманам у вялікай тады краіне, і самаадданая праца хлебаробаў па заслугах была ацэнена. Гаспадарка ўзнагароджана пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

Сённяшнія тураўляне сваімі працоўнымі дасягненнямі дастойна працягваюць традыцыі сваіх папярэднікаў. Напрыклад, жніво-2002 адкрыла новую старонку ў летапісе працоўных перамог Турава і Жыткавіцкага раёна: упершыню за ўсю гісторыю слаўнага палескага кутка экіпаж камбайнераў у складзе Сяргея Радзіёнава і Віталія Субата намалаціў больш за тысячу тон зерня. Цяпер такія працоўныя дасягненні для працаўнікоў ААТ «Тураўшчына», што аб'яднала ў пачатку XXI стагоддзя некалькі былых калектыўных гаспадарак, якія размяшчаліся побач, – звычайная з'ява. Напрыклад, у 2015 годзе механізатар Мікалай Струк ўбраў 375 га пасеваў і намалаціў на сваім «стэпавым караблі» 2366 тон зерня. За такімі вынікамі працы, поспехамі гаспадаркі – нялёгкая, паўсядзённая, але часам і няўдзячная праца патомных тураўскіх хлебаробаў, якія з дзяцінства спасцігалі сялянскую навуку, прывучаліся шанаваць родную зямлю і працу на ёй. Сёлета, напрыклад, нягледзячы на неспрыяльныя кліматычныя ўмовы, у гаспадарцы пры ўраджайнасці 71,9 цэнтнера з гектара сабралі 17265 тон збожжа. Забяспечылі земляробы сыравінай і сваю перапрацоўку. Для кансервавай вытворчасці з палёў паставілі 1221 тону гароху, 1793 тоны салодкай кукурузы. Аддачай пацешыў і грамадскі сад, дзе сабралі 264 тоны пладоў. Гэтай восенню, дарэчы, яго пляц павялічыўся яшчэ на 40 гектараў. Закладзена і кармавая база для жывёлагадоўлі. У прыватнасці, нарыхтавана 1877 тон сена, 1200 сянажу і 60565 тон сіласу. А кожны гектар кукурузы пацешыў працаўнікоў 242 цэнтнерамі масы і 63,8 збожжа, якога намалочана 1748 тон. Паспяхова праведзена ў акцыянерным грамадстве і сяўба зімавых культур. Палі збожжавых размясціліся на пляцы ў 3400 гектараў. Нямала зроблена і робіцца па падрыхтоўцы да сяўбы яравых культур. Для гэтага паднята 5000 га зябліва, занесена 17000 тон арганікі.

– За кожным вынікам, несумнеўна, вялікая і адказная праца работнікаў і спецыялістаў, – дзеліцца дырэктар ААТ «Тураўшчына» Андрэй Кузьменка. – Мне, як кіраўніку, прыемна, што нашы механізатары па выніках ўборкі занялі амаль усе верхнія прыступкі пашаны на раённых дажынках. І не толькі. Адзначаліся працаўнікі таварыства за свае працоўныя перамогі на ўзроўні вобласці.

А ў ліку прафесіяналаў сельскагаспадарчай вытворчасці кіраўнік адзначае імёны галоўнага агранома Аляксандра Блоцкага, агранома-садоўніка Васіля Зырко, інжынера Аляксандра Казлоўскага, загадчыкаў малочнатаварных фермаў Раісу Страх і Яўгена Рыдзецкага, будаўніка Канстанціна Субата...

Нельга не згадаць, што тураўская зона Жыткаўшчыны справядліва лічыцца жытніцай раёна. Так было і ў нядаўні савецкі час. Напрыклад, выдатныя паказчыкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці былі дасягнуты ў мінулыя дзесяцігоддзі ў суседняй вёсцы Запясочча. Гэтая вёска прымыкае да Турава і па размяшчэнню, і па значэнню, і па гістарычнаму развіццю. Каля трыццаці гадоў аддала вырошчванню высокіх ураджаяў, павелічэнню ўраджайнасці збожжавых, укараненню новых перспектыўных сартоў галоўны аграном гэтай гаспадаркі Ніна Антонаўна Мельнікава. Чалавек гэта нераўнадушны, прафесіянал высокага класа, кіраўнік «Клуба-100», які аб'ядноўваў 56 гаспадарак Савецкага Саюза і ставіў на мэце дасягненне 100-цэнтнернай ураджайнасці зерневых, кавалер ордэна Дружбы народаў, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі. Дзякуючы намаганням гэтай нястомнай працаўніцы гаспадарка лічылася самай перадавой у рэспубліцы. А што клуб такі існаваў – то гэта было невыпадкова: у 1987 годзе, напрыклад, у тагачасным калгасе «Перамога» атрымалі амаль 65 цэнтнераў збожжавых, а пшаніца давала на круг па 70 цэнтнераў, а на асобным 30-гектарным участку — па 93 цэнтнеры. Вось такія амаль казачныя ўраджаі атрымлівалі тут. Ды і сёння ААТ «Тураўшчына» можа пахваліцца такімі ж высокімі ўраджаямі, бо ў сваіх заслужаных настаўнікаў вучацца маладыя паслядоўнікі, якія кожную вясну выходзяць на свежую раллю з хваляваннем і надзеяй.





Так, на Тураўшчыне да зерневых культур ставяцца з асаблівай пашанай. За многія гады тут накоплены багаты вопыт іх вырошчвання. Вядома ж, праца гэта цяжкая, атрымаць добры вынік не заўсёды атрымліваецца і з-за неспрыяльных кліматычных умоў: то паводка, то засуха, то замаразак, то дажджавая залева. Вядома, што ў такіх умовах атрымаць высокі ўраджай – трэба прыкласці шмат намаганняў. За імі – умелая работа агранамічнай службы, старанная праца земляробаў, строгае захоўванне агратэхнікі і культура земляробства. Шмат набыткаў у шчырах тураўскіх працаўнікоў палёў і ферм!

А яшчэ ў Тураве з аптымізмам ацэньваюць перспектывы развіцця агародніцтва і садаводства. Адносіны да садаводства апошнія дзесяцігоддзі змяніліся карэнным чынам: мясцовая садавіна мае попыт у пакупнікоў, прыносіць прыбытак. Тут закладзены новыя сады, у якіх вырошчваюць зімовыя сарты яблык з высокімі смакавымі якасцямі, годныя для працяглага захоўвання ў сховішчах. Добра працуе і філіял ААТ «Тураўшчына» – кансервавы завод, на якім многа зроблена апошнія дзесяцігоддзі для павышэння якасці выпускаемай прадукцыі. Не толькі ў Беларусі, але і ў Маскве і Санкт-Пецярбурзе – геаграфія паставак кансерваў палескіх перапрацоўшчыкаў даволі шырокая – кансерваваная прадукцыя карыстаецца попытам.

А ў ліку разнастайнай і смачнай прадукцыі найбольшую славу мае зялёны гарошак. У тураўскіх майстроў свой сакрэт яго прыгатавання. Яны ўпэўнены: калі нехта паспрабаваў яго хоць аднойчы, нізавошта не будзе купляць другі. А вырошчваюць, дарэчы, гарох для завода пад бокам – ехаць да гарохавых палёў не больш дзесяці хвілін. Вырошчванне яго па тэрмінах выспявання асвоілі на сваіх палетках мясцовыя земляробы ўжо даўно. З гарохавага поля, напрыклад, уранку, сыравіна трапляе на венгерскую лінію па перапрацоўцы, а ў поўдзень гатовыя натуральныя кансервы зыходзяць з канвеера. Тураўляне даражаць сваёй маркай – не выкарыстоўваюць кансерванты, іх прадукцыя павінна быць толькі натуральнай.

Увогуле ж, сучасны Тураў без перабольшвання атрымаў магутнае аграпрамысловае прадпрыемства, са станаўленнем і развіццём якога бачыць свой далейшы росквіт. Несумнеўна, што гэта дазваляе мясцовым земляробам паспяхова на высокім тэхналагічным узроўні і ў самыя аптымальныя агратэхнічныя тэрміны працаваць на палях, і мець стабільныя высокія ўраджаі розных культур. Дарэчы, дзякуючы развіццю ААТ «Тураўшчына» тут пабудавана нямала жылля, а значыць, застаецца моладзь, будуць нараджацца дзеці.

Дарэчы, акрамя вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама яе перапрацоўкі, тут актыўна займаюцца агратурызмам. Дзяржава хоча бачыць сівы Тураў цэнтрам гістарычнага і экалагічнага турызму ва ўсім палескім рэгіёне, як цудоўнае месца адпачынку. Такая задача пастаўлена кіраўніцтвам краіны ведам-

ствам і ўладным структурам. З мэтай рэалізацыі турыстычнай праграмы з'явіліся ў Тураве і іншых населеных пунктах гасцінічныя комплексы, аграсядзібы. Некалькі гадоў таму тут пабудавана плывучая гасцініца – турыстычны аб'ект, які па сваёй унікальнасці адзіны ў рэспубліцы прапануе сваім кліентам самы шырокі спектр паслуг.

Увогуле, на Тураўшчыне сёння ёсць усе магчымасці як для рэалізацыі турыстычнага патэнцыялу як ў гістарычным плане, так і створаны ўмовы для прыемнага адпачынку на вадзе, для рыбалоўства і палявання. А яшчэ сучасны турыст будзе здзіўлены знаёмствам з унікальным заказнікам «Тураўскі луг», дзе асабліва ўвесну можна ўбачыць мноства птушак, многія з якіх мігрыруюць, але 16 «чырвонакніжнікаў» застаюцца тут на сталае гнездаванне...

На ўездзе ў Тураў з боку Жыткавічаў адразу ж кідаюцца ў вочы прыгожыя будынкі Тураўскага малочнага камбіната, які даў гораду 146 працоўных месцаў. Гэта зусім маладое прадпрыемства, якое наладзіла вытворчасць сыроў італьянскіх гатункаў, і саўладальнікам якога з'яўляецца ААТ «Тураўшчына». Асноўнымі пастаўшчыкамі малака на сённяшні дзень з'яўляюцца сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Жыткавіцкага і суседніх раёнаў. Акрамя таго, ААТ «Тураўскі малочны камбінат» вядзе працу па стварэнні ўласнай сыравіннай базы. Ужо цяпер прадпрыемства з'яўляецца адным з акцыянераў ААТ «Прыазёрскае-Агра» – сельскагаспадарчага прадпрыемства, размешчанага ў Жыткавіцкім раёне, дзе плануецца будаўніцтва сучаснай фермы на 900 галоў.

Кажучы пра малочную галіну, нельга не згадаць пра слыннага аператара машыннага даення з чэрніцкай жывёлагадоўчай фермы Мікалая Іванавіча Якубоўскага. Далёка за межамі раёна на працягу дзесяцігоддзяў ішла пра яго слава. Гэта адзін з лепшых жывёлаводаў сельгаспрадпрыемства і раёна. Больш 40 гадоў аддаў ён не зусім звычайнаму для мужчын занятку, але аб яркіх выніках ягонай працы сведчаць шматлікія ордэны і медалі. А бацькава жыццёвая сцежка прадоўжана адным з чатырох яго сыноў – Сяргеем. Так нарадзілася на тураўскай зямлі дынастыя мужчын-дояраў Якубоўскіх!

Увогуле, асаблівая ўвага на Тураўшчыне надаецца і ўмацаванню матэрыяльнай базы і развіццю жывёлагадоўчай галіны: пабудаваны і рэканструяваны шматлікія фермы. І ўмовы працы жывёлагадоўцаў на новых вытворчых участках выгодна адрозніваюцца ад тых, якія маюць іх калегі на звычайных фермах. На комплексах у кожнага спецыяліста свой асобны працоўны кабінет, абсталяваныя камп'тэрамі і неабходнымі прыборамі для атрымання малака высокай якасці. На ўсіх працоўных месцах чысціня і парадак. Кармы раздае тэхніка, а даенне кароў ажыцяўляецца ў даільных залах на сучасным абсталяванні. Змены ў тэхналогіі вытворчасці адразу ж адбіліся ў лепшы бок на паказчыках. Надоі ў параўнанні з мінулымі гадамі выраслі ўдвая, а то і ўтрая. Напрыклад, уражвае праца жывёлаводаў на Верасніцкай ферме. Яна недалёка ад Турава. Тут надойваюць ад кожнай каровы больш дваццаці двух кілаграмаў малака. У прыватнасці, аператары машыннага даення Наталля Фралова і Валянціна Крумкачова за месяц надойваюць па 50 і больш тон малака. А сярэднясутачныя прывагі маладняку ў Марыі Арцюховіч складаюць амаль кілаграм. Такімі вынікамі вельмі задаволена загадчыца фермы Раіса Страх, кіраўнік вельмі вопытны і адказны.

Тураўская зямля працягвае нараджаць людзей прадпрымальных, здольных на справе даказваць, што на гэтай зямлі і сёння патрэбна атрымліваць рэкордныя ўраджаі. Прыклад вядомага ў Беларусі тураўскага фермера Міхаіла Шруба, да сялянскай гаспадаркі якога далучыўся ў свой час цэлы калгас, і створана буйное





сельскагаспадарчае прадпрыемства, заснаванае на прыватнай форме ўласнасці, вынікі працы якога не могуць не радаваць – таму яскравае пацвярджэнне. Думаецца, прадпрымальніцтва на зямлі – таксама будучыня гэтага слаўнага краю.

Шмат слаўных спраў на рахунку Тураўскага дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка №111, які абслугоўвае практычна ўсе дарогі Жыткаўшчыны. Участак быў створаны больш паўстагоддзя назад. Працоўны калектыў даволі зладжаны і працалюбівы. У апошнія гады прыйшло шмат моладзі. Плённа працуюць у філіялы раённай камунальнай службы, паштовае аддзяленне і іншых прадпрыемстваў Жыткаўшчыны. У старажытным паселішчы шырока развіта гандлёвая сетка, якую прадстаўляюць розныя дзяржаўныя і прадпрымальніцкія структуры. У гарадку ёсць свой універмаг, аптэка, кнігарня, з'явіліся рэстараны і некалькі кафэ. Тут выдатныя дзве сярэднія школы, якія да 1035-годдзя Турава былі якасна адрамантаваны. У Тураве ёсць свая добрая бальніца, дзіцячы садок «Пеўнік», Дом дзіцячай творчасці, масавая бібліятэка, гарадскі Дом культуры, краязнаўчы музей. Музей прыроды Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» працуе ў гасцінічным комплексе ўстановы.

Дарэчы, пяць гадоў назад у рамках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся было прынята рашэнне аб рэканструкцыі Тураўскага культурна-адукацыйнага цэнтра (на базе Дварэцкага СДК). Абноўленая ўстанова адукацыі з творчым ухілам у 2015 годзе расчыніла свае дзверы. Тут знайшлося месца і для Тураўскай дзіцячай школы мастацтваў, а ўмовы для эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення значна палепшаны.

На ўсю рэспубліку славяцца тураўскія самадзейныя калектывы, пяць з якіх маюць званні народнага. Невыпадкова ж, пра Тураў гавораць, як пра нацыяльную скарбніцу талентаў і народных традыцый. Так, у самім Тураве з глыбокай старажытнасці, напрыклад, святкавалі Вадохрышча і Купалле. І цяпер гэтыя святы праводзяцца, не зніклі. А вось веснавы абрад «КАРАГОД» на свята Юр'я 6 мая ладзіўся некалі ва ўсіх вёсках Тураўшчыны, але ў жывой традыцыі захаваўся толькі ў вёсцы Пагост. Навукоўцы па назве тэрыторыі бытавання назвалі гэты абрад «Тураўскі карагод». Гэта невыпадкова. Тураўшчына — этнічны мікрарэгіён Усходняга Палесся, які мае свае адметнасці традыцыйнай культуры: гутарковую мову (дыялект), народны строй, такія абрады, як «Гу, вясна», «Карагод», «Жаніцьба Коміна (або Светача)», калядаванне і шчадраванне, святы народнага календара з пэўным святочным меню на кожнае, у тураўлян ёсць і асаблівасці ў харчаванні штодзённага і святочнага побыту, прылад працы, забудовы вёсак і дэкоры хат, рамёствы і промыслы. Усё гэта склалася на працягу стагоддзяў, пачынаючы ад часу засялення гэтых зямель аб'яднаннямі плямён дрыгавічоў, затым Тураўскага княства (X—XVI стагоддзі), калі гэтыя асаблівасці замацаваліся агульнасцю тэрыторыі і звычаяў. Прафесар-этнограф В.С.Цітоў яшчэ называе Тураўшчыну «Малое Палессе» ( «Народная культура Беларусі», Мн., 2002, стар.113).

А яшчэ Тураў і Тураўшчына – запаведны куток Палесся. Невыпадкова ў 1969 годзе тут быў створаны Прыпяцкі ландшафтна-гідралагічны запаведнік для захавання ў натуральным стане ўнікальнага ландшафта Беларускага Палесся, рэдкіх і знікаючых відаў жывёл і раслін, вывучэння зменаў у прыродзе, звязаных з шырокім на тыя часы вядзеннем меліярацыі ў Палескай нізіне. Некалі гэта быў першы вопыт стварэння прыродаахоўнай структуры ў Савецкім Саюзе. Цяпер запаведнік пераўтвораны ў нацыянальны парк. Тут сапраўды ўнікальная прырода. Маляўнічыя, тыпова палескія рэкі – Прыпяць, Сцвіга, Убарць, Круш-

ная, Свінавод, канал Бычок, больш за 30 азёр, багатыя лясы. Некалі тут было шмат каштоўных і прыгожых пойменных дуброў, якіх, бадай, не знойдзеш больш на тэрыторыі Беларусі. На жаль, у выніку часам неабдуманай гаспадарчай дзейнасці іх стала менш. Усяго ж у флоры нацыянальнага парка — 826 відаў вышэйшых раслін і каля 200 імхоў, 184 – лішайнікаў, каля 1000 відаў грыбоў. Адных млекакормячых тут 50 відаў, птушак –255, у вадаёмах каля 40 відаў рыб. Тут буйнейшы ў Еўропе масіў вярховых і пераходных балот...

На тэрыторыі нацыянальнага парка (адміністрацыйны цэнтр толькі нядаўна размясцілі ў аграгарадку Ляскавічы суседняга Петрыкаўскага раёна) праводзяцца навуковыя даследаванні. Багацце і прыгажосць, старажытнасць краю даўно прыцягальныя для турыстаў. З кожным годам наведванне павялічваецца. У прыродаахоўнай установе гэтую цягу людзей да прыроды ўлічваюць, стараюцца развіваць турыстычныя комплексы і базы адпачынку. Тут стварылі пешыя, аўтамабільныя і турысцкія маршруты.

Так, сапраўды новы імпульс развіццю Турава за некалькі мінулых гадоў надала Дзяржаўная праграма развіцця Прыпяцкага Палесся. Акрамя гасцініцы «Тураў» у цэнтры горада з'явілася і прыгожая набярэжная, для людзей правялі газ, пабудавалі станцыю абезжалезвання вады, вядзецца аднаўленне вадаправода, закончваецца рамонт гарадскіх вуліц. А улетку жыхароў у горадзе большае да 15 тысяч. Прыпяць і старажытны горад прыцягвае на адпачынак прыезджых, у бацькоўскія хаты ў адпачынак прыязджаюць дзеці, унукі. Сюды едуць з Прыбалтыкі, Расіі, Украіны. Ціхі і спакойны Тураў змяняецца, прыгажэе.

Верыцца, што хутка Беларусь будзе ганарыцца тым, што на гэтай зямлі захаваўся некрануты аазіс прыроды, дзе так шчасліва спалучыліся і прыгажосць ландшафтаў, і багаты раслінны і жывёльны свет, і яе вялікасць гісторыя.

## ШАНУЮЦЬ ПАМЯЦЬ ДЗЁН МІНУЛЫХ

Галоўная вуліца Турава – Ленінская – вядзе да самага цэнтра. Тут, у цэнтры, знаходзяцца грамадскія ўстановы, культурна-бытавыя будынкі, крамы. У засені дрэў гарадскога парку стаіць просты і строгі абеліск у памяць 192 землякоў, якія загінулі ў барацьбе з ворагамі Савецкай улады і нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У Вялікую Айчынную вайну з 15.07.1941 года да 5.07.1944 года Тураў акупіраваны нямецкімі фашыстамі. Падчас акупацыі на тэрыторыі раёна дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, тураўскае антыфашысцкае падполле, партызаны 50-й Жыткавіцкай брыгады, выдавалася падпольная газета «Ленінскія запаветы». Тураў быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў часцямі 61-й арміі і Дняпроўскай ваеннай флатыліі 1-га Беларускага фронта. Актыўны ўдзел у вызваленні прымала 23-я стралковая дывізія 61-й арміі.

І яшчэ адзін помнік узведзены на высокім беразе Прыпяці, на магіле 146 воінаў Савецкай Арміі і партызан, якія загінулі пры вызваленні Турава. Ля брацкай магілы і абеліска ў любую пару года – кветкі. А пра подзвіг землякоў гадасціпна раскажуць супрацоўнікі Тураўскага краязнаўчага музея.

Прыцягвае ўвагу ўсіх, хто завітвае ў Тураў, прыгожы кафедральны сабор у гонар свяціцеляў Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх. Ён пабудаваны за тры гады і асвечаны 11 мая 2013 года. Але ж мары пра яго будаўніцтва не пакідалі тураўлян аж з таго моманту, калі ў пачатку 13 стагоддзя быў у выніку землятрусу разбураны кафедральны сабор на Замкавай гары (сёння муры сабора і музейная экспазіцыя «Старажытны Тураў» адкрыта для турыстаў). Так сталася, што падчас татарскіх набегаў былое ўдзельнае Тураўскае княства страціла сваё палітычнае значэнне,





але не страціла духоўнага аўтарытэту. На працягу некалькіх стагоддзяў Тураў працягваў заставацца кафедральным горадам і пытанне пра будаўніцтва новага сабора паднімаўся неаднаразова. Напачатку ХХ стагоддзя архіепіскап Мінскі і Тураўскі Мітрафан распачаў ажыццяўленне гэтага праекта. Былі нават сабраны сродкі на будаўніцтва храма, але пачатак Першай сусветнай вайны, грамадзянская вайна і змены ў грамадскім ладзе адтэрмінавалі распачынанне зноў на цэлае стагоддзе. Клопатамі епіскапа Тураўскага і Мазырскага Стэфана была створана абшчына ў гонар свяціцеляў Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх, распачата будаўніцтва, благаслаўленае Патрыярхам Кірылам. Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам 11 мая 2010 года быў закладзены першы камень у аснову будучага сабора. І ў Цэнтральным парку горада быў пабудаваны прыгожы, велічны храм, адбылося яго ўрачыстае асвячэнне кафедральнага сабора ў гонар свяціцеляў Кірылы і Лаўрына Тураўскіх. А ў 2015 годзе годзе старажытны Тураў стаў сведкам незвычайнай падзеі. Шэсць пар, не толькі жыхароў раёна, але і іншых рэгіёнаў рэспублікі вырашылі прайсці ў Тураўскім кафедральным саборы абрад таемства шлюбу. Пасля ж цырымоніі павянчаныя пары адправіліся на Замкавую гару, каб пакланіцца святым гэтай зямлі. Там, ля помніка Кірыле Тураўскаму, сярод муроў старажытнага сабору XI стагоддзя, дзе зараз размешчана музейная экспазіцыя «Старажытны Тураў», са знамяняльным днём у жыцці іх віталі прадстаўнікі ўладаў і самадзейныя артысты. Так на святой зямлі нараджаюцца новыя традыцыі...

Так, сёння нельга ўявіць старажытны, вядомы далёка за межамі Беларусі, Тураў без яго краязнаўчага музея. Ён знаходзіцца амаль у цэнтры гарадка, побач з агульнаадукацыйнай СШ №2. Суседства выгаднае. Невялікі прыгожы будынак прыцягальны, бясспрэчна, для настаўнікаў і школьнікаў: у залах музея ладзяцца ўрокі патрыятызму, вучні далучаюцца да багатай гісторыі свайго краю і зямлі. Яны ж пры неабходнасці і дапамагаюць супрацоўнікам музея, нават самі праводзяць экскурсіі. Гэта надта добра.

Як і гэты гарадок, так і яго музей апалены суровым дыханнем часу. Ён быў створаны ў 1927 годзе, лічыцца самым старэйшым у Гомельскай вобласці. Першым дырэктарам музея стаў настаўнік геаграфіі Максім Емяльянавіч Бруй. Пачынаўся ён з традыцыйнага школьнага куточка прыроды і гісторыі. Вучні разам са сваім настаўнікам збіралі прадметы археалогіі, рэчы адыходзячага побыту, кнігі. Добрым памочнікам у гэтай справе стаў бібліятэкар Народнага дома Парфен Антонавіч Шчакатовіч, гарачы патрыёт Тураўшчыны. Ажно дзве тысячы экспанатаў налічваў музей да вайны. Музей размяшчаўся ўжо ў адным з пакояў Народнага дома. Фонды музея папаўняліся, праводзіліся масавыя мерапрыемствы, наладжваліся экскурсіі.

Перад Вялікай Айчыннай вайной у музеі былі сабраны камплекты адзення, прадметы быту і этнаграфіі, рукапісныя і друкаваныя выданні. У гады акупацыі Турава нямецкімі захопнікамі ўвесь сабраны матэрыял быў цалкам знішчаны. Пасля вайны музей аднавіў сваю працу ў маі 1950 года. Размяшчаўся ён у фае гарадскога Дома культуры. Дырэктарам быў прызначаны М.Е. Бруй, а навуковым супрацоўнікам — П.А. Шчакатовіч, які праз усё сваё жыццё пранёс вернасць збіральніцтву, юначую зацікаўленасць да гісторыі і любоў да роднай зямлі. Экспазіцыя музея дзялілася на тры раздзелы — прырода краю, дарэвалюцыйнае мінулае і сацыялістычнае будаўніцтва. З 1952 года вядзецца ўліковая дакументацыя, чытаюцца лекцыі і гутаркі, праводзяцца экскурсіі. На пасаду дырэктара прызначаецца Р.І. Запясоцкая.

На 1 студзеня 1961 года асноўны фонд музея налічваў 1291 адзінку. Яго складалі прадметы побыту, адзенне, прырода, нумізматыка, археалогія, дакументы. З 1963 года дырэктарам музея становіцца П.А. Шчакатовіч, з 1963 года навуковым супрацоўнікам прызначаецца Валянціна Міронаўна Карась, нагляднікам — Соф'я Антонаўна Бяляй. Кіраўніцтва раёна аказвала музею падтрымку і ўвагу. У 1959 годзе было прынята рашэнне Тураўскага райвыканкама «Аб будаўніцтве раённага краязнаўчага музея ў г.п. Тураве». Быў вызначаны ўчастак зямлі для будаўніцтва і зацверджаны каштарыс. Але будаўніцтва так і не пачалося, таму што быў скасаваны Тураўскі раён, а г.п. Тураў увайшоў у склад дынамічна развіваючыхся Жыткавічаў. З 1976 года дырэктарам музея працавала Валянціна Карась, якая шмат гадоў затым працавала ў музеі старшым захавальнікам фондаў. Навуковым супрацоўнікам працавала ў тыя гады Валянціна Леўкавец. У гэты перыяд значная ўвага надавалася наладжванню ўліку экспанатаў, папаўненню фондаў, правядзенню масавых мерапрыемстваў. На закупку экспанатаў райаддзел культуры выдзяляў грашовыя сродкі. Умацоўваецца матэрыяльная база. У канцы 1978 года музей пераязджае ў памяшканне былой дапаможнай школы, дзе размяшчаецца і цяпер.

За гэтыя гады асноўны фонд музея вырас да 9960 адзінак, а навукова-дапаможны — да 7000 адзінак. Сфарміраваны цікавыя калекцыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, нумізматыкі, этнаграфіі і побыту, дакументаў, фотаздымкаў і інш. У 1989 годзе была перабудавана экспазіцыя музея. Набыта неабходнае для экспазіцыі абсталяванне, афармленне праведзена на мастацкім узроўні. Зараз экспазіцыя музея складаецца з 6-ці раздзелаў: «Гісторыя старажытнага Турава», «Рэвалюцыя і грамадзянская вайна», «Этнаграфія», «Вялікая Айчынная вайна», «Сучаснае будаўніцтва», «Прырода краю». Менавіта ў мясцовым музеі, як нідзе, датыкаешся да больш чым 1000-гадовай гісторыі аднаго са старэйшых гарадоў краіны. Міжволі спыняешся ля кожнага з экспанатаў, якія перадаюць жывое дыханне часу.

Як увасобіць, чым сімвалізаваць сівую мінуўшчыну гэтага гарадка? На сённяшні дзень нам вядомы чатыры версіі паходжання назвы Турава. Усе яны таленавіта ўвасоблены ў дыпломнай рабоце тураўляніна, выпускніка Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута Аляксандра Бруя. Эскізны праект скульптуры, на якім нібы выхаплены з гісторыі паўлегендарны князь Тур, шырока распаўсюджаны ў старажытнасці дзікі бык-тур, рака Тураўлянка і Турвежа, устаноўлены ў першай зале музея. Турыстам тут доказна распавядуць, абапіраючыся на багацце легендаў, як будаваўся Тур-град, і пра самога князя... Экспанаты, дакументы, прадметы быту сведчаць аб тым, што, знаходзячыся на водным шляху «з варагаў у грэкі», тураўляне гандлявалі драўнінай, пушнінай, мёдам. Жанчыны ткалі цудоўныя паясы, мужчыны выраблялі рознае гаспадарчае кавальскае начынне, ганчарныя прадметы, залатыя крыжы. Ужо тады ў Тураве існаваў драўляны вадаправод. Тут вам пакажуць манеты князя Святаполка, фотакопіі старонак Тураўскага Евангелля. Кераміка XI-XIII стагоддзяў, калекцыі курыльных люлек, касцяныя іголкі і бранзалеты пераканаюць госця аб інтэнсіўным развіцці матэрыяльнай культуры горада ў той далёкі час.

Тураў быў і адным з цэнтраў асветы заходніх зямель Русі. На пачэсным месцы ў музеі — сведчанне таго, што ў XII стагоддзі тут жыў і працаваў вялікі прапаведнік, вядомы рэлігійны дзеяч Кіеўскай Русі Кірыла Тураўскі. Прыцягвае ўвагу наведвальнікаў стэнд «Старонкі гісторыі Турава», макет сабора, саркафаг...

Увогуле, з кожнай залай нібы ўздымаешся па прыступках стагоддзяў, становішся сведкай пераломных момантаў у далёка не простай гісторыі горада. Цікава аформлена экалагічная зала, дзе экспануецца флора і фауна Тураўшчыны. Яна багатая і разнастайная — нашы абаронцы-воіны спрадвеку славіліся і як лоўкія паляўнічыя, умелыя рыбакі. Нібы жывыя, толькі прыпыніліся на бягу, дзікі, ваўчыца, лісіцы, застылі ў палёце птушкі. Унікальная і матэрыяльная культура палешукоў у дарэвалюцыйны перыяд. Экспануюцца і рэчы этнаграфіі, якія не могуць не здзівіць нетутэйшага...

Убачанае пераконвае: вялікі крок наперад зрабілі тураўляне ў XX стагоддзі. Аб гэтым яскрава сведчаць экспанаты наступнай залы. Тут шырока паказана барацьба жыхароў Турава за перабудову грамадства на сацыялістычных пачатках, іх удзел у грамадзянскай і Айчыннай войнах. Значнае месца адводзіцца героям працы, землякам-«афганцам», сённяшняму жыццю рэгіёна. Але зноў і зноў хочацца вярнуцца ў першую залу, да сведкаў нашай беларускасці... І зноў нібы вяртаешся ў дахрысціянскі перыяд, на Замкавую гару. Тут, у цішыні, здаецца, чуеш подых стагоддзяў...

Так, уся гісторыя Тураўскай зямлі зафіксавана ў музейнай экспазіцыі. Супрацоўнікі музея праводзяць аглядавыя і тэматычныя экскурсіі, чытаюць лекцыі ў дапамогу школьнай праграме і па раздзелах экспазіцыі, праводзяць дні адчыненых дзвярэй. Для самых малых наведвальнікаў праводзяцца экскурсіі ў прыроду. Штогод афармляюцца выставы фондаў музея. Апрача гэтага, супрацоўнікі музея вывучаюць і адраджаюць са школьнікамі абрады: калядоўкі, гуканне вясны, вербны кірмаш і іншыя. Тут праводзяцца святы беларускай гульні і цацкі, дзіцячыя ранішнікі, віктарыны і турніры эрудытаў, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, з воінамі-інтэрнацыяналістамі. Распрацоўка навуковых тэм дала магчымасць сабраць друкаваныя выданні малітваў Кірылы Тураўскага, ксеракопію Тураўскага Евангелля XI стагоддзя, матэрыялы аб Канстанціну Астрожскім – асветніку XVI стагодддзя. Дзякуючы таму, што пераехала ў новы будынак музычная школа, у музея з'явіліся новыя плошчы – хутка тут будзе абноўлена экспазіцыя, гледачы пазнаёмяцца з рэдкімі экспанатамі, якія нямала ў фондах і ніколі не выстаўляліся. Многія з экспанатаў цяпер пастаянна размешчаны на музейным комплексе «Старажытны Тураў» на Замкавай гары: тут можна пабачыць узноўленае гарадзішча, макеты Замчышча ў мінулым, храма XII стагоддзя, даведаецеся што такога арыгінальнага архітэктурнага дойлідства, як у Тураве, не было больш нідзе...

Дзверы Тураўскага краязнаўчага музея заўсёды гасцінна расчынены для наведвальнікаў. У музеі чыста, утульна, а гасціннасць і ўтульнасць ствараюцца супрацоўнікамі Васілём Балбуцкім, Сяргеем Марозам, Надзеяй Чыкіда і Вікторыяй Сакавец. У 2015 годзе музей невялічкага гарадка наведала звыш 20 тысяч чалавек. Гэта сведчыць: і сёння духоўнасць для многіх з нас значыць многа.

## МНОЖАЦЬ СЛАВУ ЗАЛАТАВУСТА

Даўно няма на Зямлі Залатавуста 12 стагоддзя, які жыў у Тураве. Змянілася непазнавальна за тысячагоддзе і сама гэта зямля. Аднак працягвае нараджаць слаўных сыноў і дачок, якімі ганарацца нашчадкі Кірыла Тураўскага. Скажам некалькі слоў аб іх.

Цяпер на месцы былога старажытнага горада – некалькі асобных вёсак, дзе яшчэ ў 30-я гады мінулага стагоддзя былі праваслаўныя храмы і капліцы. Царкоўныя праваслаўныя прыходы нядаўна адрадзіліся ў ваколіцах былога тураўскага прадмесця – вёсках Пагост і Запясочча.

Быць у Тураве і не зайсці ў царкву Усіх Святых нельга. Царква гэтая драўляная, пабудаваная ў 1810 годзе на могілках, і можа толькі гэтыя абставіны выратавалі яе ад паругання і знішчэння. З вуліцы Ленінскай добра відаць атулены зелянінай трохзрубны храм – узор будаўнічага мастацтва мясцовых народных майстроў. Нядаўна з заходняй часткі царквы была прыбудавана невялікая званіца з шатровым дахам. Царква асабліва нічым не вызначаецца, убранства яе надта простае. Галоўная яго частка – двухярусны іканастас, упрыгожаны простай, але дастаткова прыгожай разьбой мясцовых умельцаў. Тут дзейнічае прыхадская школа, дзе да праваслаўных святынь далучаюцца каля 30 дзяцей, радуе чыстай малітвай і ангельскім спевам дзіцячы хор, утварылася невялікая бібліятэка пры Храме. Ля сведкі гісторыі паселішча на працягу апошніх 200 гадоў, на тэрыторыі царкоўнай сядзібы, Братствам трох Віленскіх мучанікаў Антонія, Еўстафія і Іаана пры Мінскай Петрапаўлаўскай царкве пастаўлены помнік ураджэнцу Турава, князю Канстанціну (Васілю) Астрожскаму – вялікаму князю, выдатнаму кнігавыдаўцу і абаронцу праваслаўя. Тут пахавана нямала слаўных дачок і сыноў Турава...

А на месцы старажытнага епіскапскага манастыра і кафедральнага сабора ў імя святых Барыса і Глеба яшчэ адны могілкі. Яны так і называюцца: Барысаглебскія. Знаходзяцца яны ў нейкіх паўкіламетра ад Турава, добра бачныя з самага, відаць, шануемага месца тураўлянамі – Замкавай гары. Гадоў пятнаццаць таму зноў узнеслася літургічная малітва ў маленькай царкве-каплічцы: спачатку драўлянай, потым цаглянай. Кожны чацвер тут служацца малебны свяціцелю Кірылу, мошчы якога паводле падання і па ўспамінах мясцовых жыхароў знаходзяцца ў нетрах гэтай святой зямлі. Дарэчы, тут захоўваецца і старажытная ікона (ніхто не ведае, калі яна была напісана, як з'явілася на Тураўшчыне) Казанскай Божай Маці. Час бязвер'я яе не пашкадаваў. Раней на ёй ледзьве праступаў вобраз Божай Маці, а цяпер, калі яна на пастаянна «прапісалася» ў моліклавай каплічцы, з кожным годам фарбы становяцца ўсё больш яркімі. Так да растучых крыжоў, якія, як тут пераканае госця любы месціч, пазбаўляюць і вылечваюць ад розных захворванняў, дадалася яшчэ адна цудадзейная святыня.

Горад паціху па праву вяртае сваё былое духоўнае значэнне, як цэнтр адной з самых старажытных епархій. Гэтаму спрыяюць духоўныя і свецкія святы, што апошнія дзесяць гадоў праходзяць у Тураве ў гонар святога Кірылы Тураўскага. Часта царкоўныя службы ў Тураве праводзіць епіскап Турава-Мазырскі Леанід. Паслядоўнікі святога Кірыла Тураўскага пераканаmake, што духоўнае значэнне Турава будзе павялічвацца, і ўслед за Полацкам на Тураўскай зямлі заззяе духоўнае святло. Галоўнае, каб мы больш не гублялі духоўнай еднасці са сваімі святынямі.

... Адна з вуліц у Тураве цяпер носіць імя земляка-пісьменніка Навума Перкіна. Тут нарадзіўся Навум Саламонавіч у 1912 годзе, ў сям'і саматужніка. У 2002 годзе адзначалася 90-годдзе з дня нараджэння слыннага земляка. У 1928 годзе ён паступіў у Гомельскі педагагічны тэхнікум, у 1929 – 1931 гадах настаўнічаў у пачатковых школах на Гомельшчыне. Быў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Двойчы паранены. У друку з літаратурна-крытычнымі артыкуламі, рэцэнзіямі пачаў выступаць з 1946 года. Даследаваў творчасць А. Куляшова, П. Броўкі, П. Глебкі. Апублікаваў аўтабіяграфічныя мастацкія творы «Мальчик из местечка», «Я стал партизаном». Тураўляне памятаюць і ўшаноўваюць памяць свайго земляка.





Урач, чыімі намаганнямі пабудавана Тураўская бальніца, самабытны паэт, чалавек вялікага сэрца – менавіта такія словы знойдуць найперш мясцовыя жыхары, калі ў іх запытаешся пра Уладзіміра Міхайлавіча Волкава. Так, на самай справе гэта быў незвычайны чалавек, які надта любіў сваю зямлю, і ёй прысвяціў сваё жыццё, імкнуўся абудзіць годнасць людзей, патомкаў легендарных дрыгавічоў.

І нарадзіўся Уладзімір Волкаў у Тураве. Цяжкая хвароба прыкавала ў дзяцінстве хлопчыка да ложка. Вось што піша пра яго кандыдат біялагічных навук С. А. Сяргейчык: «Магутная сіла волі дапамагла ўстаць на ногі, перамагчы інваліднасць і стаць, як марыў, урачом, каб дапамагаць людзям, пакуты якіх ён добра разумеў...»

У 1968 годзе Валодзя Волкаў скончыў Тураўскую сярэднюю школу №1, а ўжо ў 1975 годзе пасля заканчэння медінстытута малады хірург прымае хворых у звычайнай бальнічцы аднаго з сібірскіх гарадкоў. Праз некаторы час праходзіць ардынатуру. Сэрца ўвесь час цягнулася на радзіму, яно ж нараджала пра родную зямлю вершы. І вось у 1981 годзе Волкаў – галоўны ўрач Тураўскай бальніцы. З вялікім энтузіязмам і настойлівасцю бярэцца за будаўніцтва новай бальніцы – да гэтага за шмат год прыйшлося наведаць сотні высокіх кабінетаў. Здрадзіла і здароўе, аднак таленавіты ўрач дамогся свайго. Дапамагалі яму тагачасны старшыня калгаса «Новае жыццё» М.М. Арцюшка, і нават народны пісьменнік Беларусі В.У. Быкаў, які ў тыя гады прадстаўляў Жыткавіцкі раён у Вярхоўным Савеце БССР. У 1988 годзе выдатна абсталяваная бальніца прыняла першых хворых. Волкаў марыў стварыць на базе бальніцы дыягнастычна-курортны цэнтр. Ды мара так і засталася марай – ў жніўні 1989 года, на 39 годзе свайго жыцця, ён памёр. На «уратавальным караблі», як кажуць пра бальніцу мясцовыя жыхары, цяпер ёсць мемарыяльная дошка: «Тут працаваў Уладзімір Мікалаевіч Волкаў, галоўны ўрач, хірург, добры чалавек. Дзякуючы яго самаадданасці пабудавана гэтая бальніца». Пахаваны У. Волкаў якраз ля Ўсясвяцкай царквы ў Тураве, насупраць трохпавярховага будынка бальніцы — прыжыццёвага помніка, які пакінуў людзям пры жыцці...

Славу тураўскай зямлі памножыў ў 1977 годзе камсамолец Міша Мароз, пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Ён вынес з поля снарад часоў Вялікай Айчыннай вайны, выратаваў людзей і тэхніку, але сам загінуў. Маладыя беларускія скульптары І. Патапаў і С. Бандарэнка распрацавалі праект помніка Мішу Марозу, які ўстаноўлены ў горадзе Жыткавічы, перад школай №1: ідзе ён па няроўным полі, прыціскаючы да грудзей смертаносную ношу, і побач – полымя ўзрыву. А ў роднай Хільчыцкай сярэдняй школе ўжо некалькі дзесяткаў год працуе музей памяці адважнага земляка...

Дарэчы, Хільчыцы – вельмі старадаўняя вёска, што таксама мяжуе з Туравам, у якой не злічыць старадаўніх курганоў і магільнікаў, — радзіма паэта Паўла Шруба, які ў 15-гадовым узросце паступіў на фізічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў Павел Міхайлавіч у Полацкім політэхнічным інстытуце, у інстытуце ядзернай энергетыкі АН БССР, выкладчыкам у Мінскай сярэдняй спецыяльнай школе міліцыі імя М.В. Фрунзе. І колькі сябе памятае – пісаў вершы. Выдаў некалькі кніг паэзіі—большасць твораў «замешана» на родным палескім грунце. Удастоены ў 1987 годзе прэміі Ленінскага камсамола Беларусі за кнігу паэзіі «Лабараторыя»...

Славілі Тураўшчыну вершаванымі радкамі, мастацкай прозай і публіцыстыкай Мікола Клімовіч і Кацярына Папова, у яе гонар складаюць свае творы Вера Квяткоўская, Галіна Дашкевіч, Віктар Папок, Святлана Бал-

буцкая і многія іншыя ўраджэнцы гэтай зямлі. Хто ведае, можа творы некага з іх, нашчадкаў Кірылы Тураўскага, хутка загучаць на ўсю Беларусь! Дай Бог, каб гэта здарылася!

Увогуле ж, трэба сказаць, што тураўляне — вялікія патрыёты свайго краю. Так было ў гістарычныя часы, калі насельніцтва горада не раз мужна ўзнімалася на барацьбу і гераічна абараняла яго ад ворагаў, гэта адчуваецца і цяпер. Яны хочуць бачыць свой горад ажыўленым, шматлюдным, у росквіце. Як хацеў гэтага былы мэр Турава Мікалай Мікалевіч Арцюшка. Яшчэ нядаўна здавалася, што паважаны тураўлянамі знаўца тураўскай гісторыі будзе яшчэ шмат гадоў клапаціцца пра свой горад і яго жыхароў. Але таленавітага чалавека, самадзейнага паэта, які дбаў пра нашы духоўныя вытокі, фальклор і гісторыю, што імкнуўся распавесці пра яе нават у далёкай Швецыі, раптоўна не стала...

Турава-жыткавіцкая зямля шчодра нараджае людзей, здольных хораша спяваць і танцаваць. Тут, у глыбінцы Палесся, жывуць добрыя, працавітыя і таленавітыя людзі. У кожнай хаце можна сустрэць чалавека, які любіць спевы або народныя танцы, вышываць або плесці з лазы, ткаць або маляваць.

Не толькі ў рэспубліцы, але ў бліжнім і дальнім замежжы вядомы народныя калектывы Турава. І першым па праву назавём калектыў Тураўскага народнага хора. Стваральнікам і першым мастацкім кіраўніком яго быў Сцяпан Аляксеевіч Радзіёнаў. У далёкім 1945 годзе ён, афіцэр запасу, з дванаццаці калгаснікаў сельгасарцелі «Новае жыццё» стварыў самабытны калектыў.

Вялікі поспех чакаў хор у перыяд, калі ім кіраваў малады спецыяліст, выдатны баяніст Мікалай Бяспалаў. Ён беражліва расціў новых удзельнікаў, умела шліфаваў культуру выканання. У рэпертуары былі апрацаваныя Бяспалавым народныя песні. У 1955 годзе тураўскі хор выступаў на дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве, і ўсе яго 68 удзельнікаў былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, а кіраўнік медалём «За працоўную доблесць». З года у год расло майстэрства гэтага выдатнага калетыва, у 1962 годзе яму было прысвоена званне «народны хор», а кіраўнік стаў заслужаным дзеячам культуры БССР. У 1964 годзе хорам кіруе таленавіты самадзейны артыст Сяргей Рыгоравіч Белка. Праз год хор выступаў у Маскве на ВДНГ, хор быў узнагароджаны бронзавым медалём. Апошнія пяць гадоў хорам кіруе таленавіты музыка Васіль Птушко — чалавек незвычайна ўлюбёны ў сваю справу, родную беларускую песню. Ён сам піша тэксты песен і музыку для іх, а калектыў іх выконвае. Васіль Адамавіч — аўтар песні «Аб Тураве», якую надта любяць слухаць яго землякі. Тураўскі народны хор штогод прымае ўдзел у абласных і рэспубліканскіх фестывалях, становіцца пераможцам і лаўрэатам. Некалькі пакаленняў тураўлян складалі гэты славуты калектыў. І зараз харавы калектыў працуе над адраджэннем беларускай песні. Тураўскі народны хор — частка нашай гісторыі, яркай і непаўторнай, — цяпер носіць званне Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь.

А яшчэ хочацца распавесці пра аднаго таленавітага чалавека. Гэта, мабыць, на сённяшні дзень, самы вядомы туравец, хоць родам ён і не адсюль, але ж карані яго моцна ўвайшлі ў Тураўскую зямлю. Выдатны балетмайстар, носьбіт і прапагандыст беларускай народнай харэаграфічнай культуры Мікола Котаў нарадзіўся на спеўнай рэчыцкай зямлі. У 1964 годзе па ўласнаму жаданню трапіў у старажытны Тураў — у той час у цэнтры славутага паселішча гарэў адзіны ліхтар, а гасцініца месцілася ў звычайнай сялянскай хаціне. Аднак гэта не спалохала юнака, і ён пачаў працаваць. Праз нейкі час ім быў створаны





харэаграфічны калектыў — ансамбль танца «Прыпяць». Гэты калектыў нельга і дагэтуль зблытаць з іншымі ансамблямі, рэпертуар якога складаўся з суквецця паляшуцкіх танцаў. Мастацтва тураўскага калектыва не раз адзначалася рознымі ўзнагародамі, прызнана далёка за межамі Беларусі. Не абышоў нават увагай Котава і калектыў знакаміты кінарэжысёр Віктар Тураў — у фільме «Людзі на балоце» браў удзел народны ансамбль танца «Прыпяць», а Мікола іграў вясёлага дзеда-палешука.

Цяпер балетмайстар жыве і працуе ў Мінску, але амаль штомесяц бывае ў Жыткавіцкім раёне, у Тураве, які па-ранейшаму жывіць яго творчую дзейнасць. Ён ставіць танцы ў «Прыпяці», дапамагаў стварыць фальклорна-харэаграфічны дзіцячы тэатр «Дрыгавічы». Пра сябе Котаў кажа так: «Я шчаслівы чалавек, што выхожу на сцэну і танцую. Я ў захапленні ад сваёй творчай працы, бо бачу, як народ адносіцца да сваёй спадчыны, як свецяцца вочы ў селяніна, які глядзіць на скокі. Сэрцам і душой паважаю свой народ, свой танец.» І шчаслівыя тураўляне, якім лёс падараваў сустрэчу з такім магутным талентам, увасобіўшы ў танцы культуру палешукоў. Таму і не дзіўна, што Мікола Котаў — свой, тутэйшы, ён афіцыйна — ганаровы жыхар старажытнага Турава...

А народны ансамбль танца «Прыпяць» Тураўскага ГДК не стаіць на месцы. У ім займаюцца рабочыя, служачыя, культработнікі, вучні сярэдніх школ Турава. Больш 40 гадоў калектыў горда нясе па жыцці званне народнага. Калектыў шырока прапагандуе сваё высокае майстэрства перад працаўнікамі раёна, з'яўляецца удзельнікам і лаўрэатам усіх абласных і рэспубліканскіх смотраў-конкурсаў, фестываляў. З 1990 года калектывам кіруе ўлюбёны ў сваю працу чалавек А.М. Пяшэвіч. Нядаўна калектыў быў узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры Беларусі. За амаль паўстагоддзе калектыў выступаў на шматлікіх сцэнах сталіц рэспублік былога СССР, Чэхаславакіі, Германіі. Усюды палескіх танцораў чакаў поспех. Застаецца дадаць, што за час існавання школу танцавальнага майстэрства ў «Прыпяці» прайшло больш тысячы чалавек...

Багатая на песенныя традыцыі палеская зямля! Спакон вякоў так павялося, што нялёгкую працу селяніна на полі, сенажаці, пад час малацьбы суправаджала песня. І калі яна гучала, нібы разгладжваліся шурпатыя мазолістыя далоні, цяплела на сэрцы.

Больш трыццаці гадоў жывуць, працуюць з песняй побач удзельнікі мастацкай самадзейнасці яшчэ аднаго Дома культуры сучаснага Турава — Дварэцкага. З 2015 года ён называецца іначай: Тураўскі культурна-адукацыйны цэнтр. Сюды на працягу дзесяцігоддзяў прыходзілі работнікі бухгалтэрыі калгаса, жывёлаводы, будаўнікі, паляводы, настаўнікі, пасля нялёгкай дзённай працы спяшаліся ў калгасны дом культуры, дзе іх заўсёды чакаў незвычайны чалавек, з якога ўсё і пачалося...

Іван Шруб прыехаў ў Тураў амаль паўстагоддзя таму. Малады выкладчык мясцовай дзіцячай музычнай школы адразу палюбіўся жыхарам пасёлка: «Свой хлопец, бо іграе добра!» Працы сваёй Шруб аддаваўся без астатку, і нават не ўяўляў сабе, што можна жыць неяк іначай. Надта любіў юнак самабытную прыгажосць народных песень — найкаштоўнейшы скарб зямлі, і вучыў любіць гэтак сваіх навучэнцаў. Тут, у Тураве, спаткаў сваё каханне — прыгажуню Галіну, гэтаксама, як і сам, выкладчыка музыкі. Наканавана, відаць, было так, каб сям'ю стварылі людзі апантаныя, таленавітыя, улюбёныя ў народную песню. Сямейная «садружнасць» музычнай пары дала немалы плён. Праз нейкі час Іван Архіпавіч ужо ўзначальваў музычную школу, разам з калегамі прымаў

удзел у мастацкай самадзейнасці. Але марыў Шруб стварыць свой калектыў. Харавы. Неяк падзяліўся сваімі думкамі са старшынёй калгаса «Новае жыццё» Мікалаем Арцюшкам. Той – сам актыўны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці – «загарэўся»: «Давай, Іване! Добрая справа! Чым магу – дапамагу!» І не падвёў. І сам паказваў прыклад, удзельнічаў у калектыве, пераканаў праўленне выдзеліць сродкі для набыцця касцюмаў...

Так у вёсцы Дварэц нарадзіўся новы калектыў. На сцэне калгаснага ачага культуры быў і ўдалы дэбют калгаснага хору. Назву яму доўга не шукалі – у палескім багатым кутку жывём, таму і «Палессе». Рэпертуар падбіралі самі. Не маглі ў яго не ўвайсці песні, што здаўна спяваліся на Тураўшчыне. Праз сваю душу прапусціў іх І.А. Шруб, зрабіў іх апрацоўку і аранжыроўку. Абноўленымі, але не згубіўшымі ранейшай прыцягальнасці, загучалі «Ой, у полі азёрачка», «Ой, пайду я на ту гору», «Туман ярам»... Мастацкая самадзейнасць захапіла як Івана Архіпавіча, так і яго жонку, выдатную спявачку Ганну Кірылаўну.

Канешне, нялёгка было стварыць калектыў, якому не сорамна было выступаць на любой сцэне. Шмат высілкаў і майстэрства прыклаў як кіраўнік, так і ўдзельнікі хору, каб музычная кампазіцыя «зажыла». Ды ўзаемаразуменне іх дало плён. Ды як жа паспяхова – праз тры гады з дня заснавання хору «Палессе» Дварэцкага СДК было прысвоена званне народнага! З таго моманту высокую планку выканальніцкага майстэрства тураўскія спевакі не зніжалі ніколі. У рэпертуары гучалі беларускія, рускія, украінскія народныя, аўтарскія песні. І кожная песня – гэта сапраўды споведзь сэрца, чыстая, як вялікая палеская Прыпяць, як сотні палескіх крыніц і шчырая, як палеская душа. Паўсюль, а за дзесяткі гадоў канцэртнай дзейнасці самадзейныя артысты пабывалі практычна ва ўсіх населеных пунктах Лельчыцкага, Петрыкаўскага, Столінскага, іншых раёнах і гарадах Беларусі. За два дзесяткі гадоў харавы калектыў сабраў у свой актыў больш чым за сотню песен! І рэпертуар яго ўвесь час абнаўляецца і ўзбагачаецца, а ў калектыў кожны год прыходзяць маладыя сілы.

Прыемна заўважыць, што сярод першых вучняў Івана Архіпавіча быў і вядомы беларускі кампазітар Мікола Сацура, многія вучні выдатнага музыканта паступілі ў музычныя вучылішчы, закончылі і паспяхова працуюць у розных куточках рэспублікі. Вось на якіх людзях трымаецца культура ў Тураве! Няма ўжо на свеце Івана Шруба, але яго добрую справу працягваюць маладыя. Ды жонка, якая дагэтуль выкладае і спявае ў хоры...

У Тураўскім гарадскім Доме культуры ёсць і яшчэ адзін народны ансамбль, які носіць назву «Ярок». У 1975 годзе загарэлася яго зорачка, каб дарыць радасць і задавальненне жыхарам гарадскога пасёлка, працаўнікам навакольных вёсак. Дзякуючы гэтаму калектыву ў Беларусі стала надта папулярнай беларуская песня «Цячэ вада ў ярок»: у 1980 годзе калектыў ва ўласнай апрацоўцы ўпершыню выканаў гэтую песню на Гомельскім тэлебачанні. Кіраўнік самадзейнага мастацкага калектыва Кацярына Пятроўна Домніч зрабіла апрацоўку гэтай народнай песні, і яна ўбачыла новае жыццё. Песня стала сапраўднай візітоўкай калетыва. Дзе толькі за апошнія дзесяцігоддзі ансамбль «Ярок» не выступаў! І ўсюды самабытнае мастацтва тураўскіх спявачак выклікала захапленне і ўдзячнасць гледачоў. Бо песні іх кранаюць душу, дапамагаюць жыць і працаваць. І ці не гэта галоўнае, што намагаюцца зрабіць самадзейныя артысты. Дарэчы, плённа працуе на ніве культуры і яшчэ адзін народны калектыў - ансамбль народнай песні ветэранаў працы «Залаты ўзрост». Творчасць сталых людзей кранае ўсіх!





Багатая Тураўская зямля!.. Той, хто яе наведае, знойдзе нешта важнае і новае, раней не зведанае, для сябе. Дасціпнага чалавека, даследчыка тут безумоўна зацікавяць сляды далёкай мінуўшчыны ў ваколіцах горада. Этнограф, бясспрэчна, зацікавіцца асаблівай, адрознай ад іншых мясцін, каларытнай мовай жыхароў гэтага палескага куточка, асаблівасцямі іх побыту, нораву культуры. Фалькларыста не пакіне раўнадушным песеннасць і высокі мастацкі густ жыхароў Турава і навакольных вёсак, шматлікія легенды і паданні. І ўсё гэта заснавана на вялікім, багатым гістарычным матэрыяле, які за многія стагоддзі напластаваліся на культурным развіцці ўсяго краю.

І гэта – не выпадкова. Хоць сёння Тураў не можа пахваліцца, як у мінулыя часы сваёй сілай, магутнасцю, значэннем, але ён застаецца важным культурным цэнтрам Беларусі. Штогод сівы гарадок з паэтычнымі паданнямі на пачатку другой дэкады мая прымае гасцей з усіх куткоў рэспублікі. Збіраюцца сюды дзеячы культуры і навукоўцы, святары і вернікі – усе, хто неабыякавы да нацыянальнага адраджэння, да гістарычнай мінуўшчыны гэтага краю. На чарговыя ўгодкі памяці святара-літаратара прыязджаюць прадстаўнікі кіраўніцтва дзяржавы, паэты і пісьменнікі, паломнікі. Светла ў такія дні на душы ад разумення, што адраджэнне нацыі можа пачацца толькі з адраджэння ў народзе памяці пра жыццё і справы далёкіх і блізкіх продкаў, з прымнажэння іх неацэнных духоўных набыткаў. Здаецца, што мудрае слова свяціцеля Кірылы Тураўскага, жывое і дзейснае ва ўсім славянскім свеце, дапаможа ўзвесці храм уласнай душы кожнаму, хто жыве любоўю да Бацькаўшчыны і ў каго ў скутныя для яе часіны не замоўк голас сумлення.

Духоўным адраджэннем, далучэннем дзетак да той крыніцы, якая тут ніколі не змялее – да нашай культурнай спадчыны – прасякнуты вучэбна-выхаваўчы працэс у двух сучасных сярэдніх школах, дзіцячым садку і доме дзіцячай творчасці. З творчым настроем працуюць у Тураве каля сямі дзесяткаў педагогаў і выхавальнікаў, якія навучаюць і выхоўваюць больш чатырохсот дзетак. І, трэба сказаць, вучні тураўскіх школ і выхаванцы Дома дзіцячай творчасці заўсёды ў ліку пераможцаў раённых і абласных алімпіяд, аглядаў і конкурсаў. Выкарыстоўваючы ўсе наяўныя сродкі, педагагічныя калектывы імкнуцца выхаваць у юных тураўлян пачуццё любові да роднага краю, да яго гісторыі, да працы, высокія чалавечыя якасці. У сярэдняй школе №2 плённа працуе музей Кірылы Тураўскага. Пачыналі яго стварэнне дырэктары гэтай навучальнай установы Г.І. Шатоўская, М.Я. Радзіёнава, затым прадоўжыла настаўніца хіміі, але гісторык і філолаг у душы Т.І. Сілкова. Вялікая выхаваўчая работа праводзіцца саветам музея з усімі вучнямі школы. Намаганнямі дзетак і педагога апошнім часам сабраны і сістэматызаваны матэрыялы пра вялікага асветніка. Дарэчы, шмат гурткоў для дзяцей працуе ў гарадскім Доме культуры і Тураўскім культурна-адукацыйным цэнтры. Таму і не выпадкова, што вучні тураўскіх школ вызначаюцца выхаванасцю, працавітасцю, актыўнай жыццёвай пазіцыяй.

У мінулым годзе старажытны Тураў адзначыў сваё 1035-годдзе. Аўтар гэтых радкоў быў сведкам, з якой цеплынёй і павагай гарадское і раённае кіраўніцтва ўшаноўвалі лепшых працаўнікоў горада. І таму не магу не назваць людзей, якія працягваюць працоўныя традыцыі сваіх папярэднікаў: сістэмнага адміністратара Ігара Домніча, наладчыка кантрольна-вымяральных прыбораў Эдуарда Меляшчэню, апаратара ліній у вытворчасці харчовай прадукцыі Аляксея Мошкіна (усе работнікі ААТ «Тураўскі малочны камбінат»), дарожнага работніка ДЭУ-111 Любоў Чыкіду, электрыка Тураўскага ўчастка электрасетак Аляксандра Журко,

загадчыка лабараторыяй Тураўскай гарадской бальніцы Галіну Рыжанкову, завуча па навучальнай рабоце сярэдняй школы №1 Тамару Шруб, выкладчыка сярэдняй школы №2 Таццяну Сілкову, выхавальніка дзіцячага саду-ясляў «Пеўнік» Еўдакію Верабей, трактарыста ўчастка Тураўскага камунальнага ўчастка Мікалая Жыткаўца, бухгалтара Тураўскага каапгандлю Вольгу Сімановмч, загадчыцу Тураўскай аптэкі Людмілу Каралец, работніцу ДЭУ-48 Людмілу Струк, трактарыста ААТ «Тураўшчына» Кастуся Шкурко, інжынера-мікрабіёлага ААТ «Тураўшчына» Ірыну Вярэніч, трактарыста ААТ «Тураўшчына» Барыса Сухарэўскага, аператара па штучным асемяненні жывёлы ААТ «Тураўшчына» Валянціну Паддубную. Памятаецца, як хораша ўшаноўвалі маладых Дзмітрыя Дарошка і Дар'ю Сулковскую, «залатых» і «срэбных» юбіляраў — Аляксандра і Вольгу Какора, і Мікалая і Марыну Катовіч ...

...На жаль, пра ўсіх тураўлян, адораных талентам, цяжка распавесці. Шмат іх, харошых людзей, на гэтай зямлі. Толькі ў савецкія часы высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена чатыром прадстаўнікам Тураўшчыны – аграному М.С. Ісаевай, цятяніцы С.І. Марусіч, трактарыстам М.В. Рудэнку, А.М. Тачыле. За сваю сумленную працу стаў кавалерам ордэна Чырвонай Зоркі, трох ордэнаў Леніна старшыня калгаса М.А. Якубоўскі. Дактарамі біялагічных навук сталі Д.С. Голад, С.А. Сяргейчык. Творчы калектыў музычнай школы заўсёды ў пошуку. З гэтай установы пуцёўку ў жыццё атрымаў саліст вядомага ансамбля «Сябры», кампазітар Мікалай Сацура . На Беларусі добра вядомы мастак М. Андык, спявак М. Пацук — хіба пералічыш усіх, хто праславіў талентам і працай сваёй гэтую зямлю!

Калі наведаеце гэты загадкавы гарадок – спытаўцеся лепш пра іх у тураўлян — вам абавязкова раскажуць пра працоўныя і баявыя подзвігі землякоў.

## ДЗЕ ЯШЧЭ ЗНАЙСЦІ ЗЯМЛЮ ТАКУЮ...

Нельга не сказаць, бадай, галоўнага. Тураўшчына і Жыткавіцкі раён, край з самым старажытным землеробствам на Беларусі, край, дзе людзі пачалі аседла жыць раней, чым у іншых яе кутках, дзе найбольш захаваліся народныя традыцыі. З Тураўшчыны і Полаччыны пайшоў беларускі народ, адсюль пайшло праваслаўе на Беларусі.

Адметныя гэтыя мясціны і сваёй гаворкай. Які яшчэ раён Беларусі можа пахваліцца тым, што мае свой лексічны слоўнік? А вось Тураўшчына займела такі пяцітомнік. Тут мова сапраўды асаблівая!

На працягу 10 гадоў удзельнікі дыялекталагічных экспедыцый Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН Беларусі працавалі ў наваколлі старажытнага Турава над выяўленнем і рэгістрацыяй лексікі жывой мясцовай мовы. У выніку напружанай работы запісана 20 тысяч слоў. На аснове картатэкі сабраных матэрыялаў да гэтых слоў падрыхтаваны «Тураўскі слоўнік», які выйшаў у свет у пяці тамах, дзякуючы намаганням складальнікаў: А.А. Крывіцкага, І.Я. Яшкіна і Г.А. Цыкуна, удзельнікаў шматлікіх экспедыцый Г.Ф. Вештарт, І.П. Кавальчука,Э.Г. Якушава, П.А. Міхайлава, В.Д. Лабка, П.В. Садоўскага, Л.У. Выгоннай. У іх сабрана лексіка гаворак Турава і навакольных вёсак, якая вылучаецца каларытам і выключнай насычанасцю старажытнымі ўсходне-славянскімі рэгіяналізмамі.

На Тураўшчыне сканцэнтраваны гаворкі ўсяго беларускага Палесся – гэтаму паспрыялі гістарычныя ўмовы, бо — Тураў быў культурна-палітычны і гандлёвы цэнтр, дзе ў мінулым уступалі ў зносіны жыхары розных куткоў Палесся.





У традыцыйнай гаворцы тураўлян і жыхароў навакольных вёсак назіраецца, з аднаго боку, пэўная прыглушанасць, сцёртасць розных яркіх усходнепалескіх дыялектычных рыс у параўнанні з гаворкамі іх суседзяў на ўсход і на поўдзень ад Сцвігі, і, з другога – стракатае багацце лексікі, таму што сюды сплываліся і тут, натуральна, нівеліраваліся, моўныя здабыткі з шырокіх абшараў Палесся. У збіральніцкай справе вучоным вялікую дапамогу аказалі настаўнікі Тураўшчыны.

Тураўляне могуць ганарыцца і тым, што нават маюць свой часопіс «Тураўшчына». Больш дзесятка гадоў таму створана навукова-асветніцкае таварыства з цэнтрам у Тураве. У яго ўваходзяць каля 40 навукоўцаў, прадстаўнікі грамадскасці, кіруючыя работнікі як Турава, так і Жыткавіцкага раёна. Старшыня таварыства – Лысенка Пётр Фёдаравіч, археолаг, доктар гістарычных навук, які неаднаразова рабіў раскопкі на Замкавай гары ў Тураве. Таварыства на працягу апошніх гадоў выдала некалькі нумароў часопіса пад назвай «Тураўшчына – сучаснасць і мінулае». У часопісе друкуюцца навуковыя працы вучоных, прысвечаныя вывучэнню сівой легенды Палесся – Турава і Тураўскай зямлі, археалагічных помнікаў, гісторыі, прыроды, традыцыйных побыту, мастацтва, гаворак, змяшчаюцца артыкулы спецыялістаў з Жыткавіцкага, Петрыкаўскага, Лельчыцкага Гомельскай вобласці, Столінскага раёна Брэсцкай вобласці пра гаспадарчае, сацыяльнае і культурнае жыццё на Тураўшчыне. Акрамя гэтага, часопіс прапануе змястоўныя і цікавыя матэрыялы, запісаныя ад мясцовых жыхароў і ці ад людзей, якія тут жылі. Матэрыялы нават падаюцца на тураўскай гаворцы. І гэта вельмі важна для сённяшняга дня, калі традыцыйнае жыццё моцна парушана, моладзь імкнецца ў вялікія гарады, распадаюцца роды. І часопіс створаны для таго, каб захаваць каштоўныя народныя традыцыі, каб моладзі пераняць жыццёвы вопыт.Плённа, дарэчы, працуе і яшчэ адно гісторыка-культурнае таварыства імя Кірылы Тураўскага ў Гомелі, якое ўзначальвае старшыня абласнога Савета дэпутатаў В.С. Сяліцкі, — патрыёты свайго краю, сапраўдныя энтузіясты прапагандуюць ідэі вялікага асветніка і прыкладаюць шмат намаганняў па ўмацаванню духоўных і эканамічных сувязяў паміж славянскімі народамі.

Можа, дзякуючы вялікім агульным намаганням тут яшчэ захавалася традыцыйная мясцовая культура (дыялект, побыт, святы, абрады, песні, адзенне), якая ўяўляе значны інтарэс для лінгвістаў, этнографаў, гісторыкаў, пісьменнікаў. Можа, таму ў найменшай меры, у параўнанні з іншымі мясцінамі Беларусі, на Тураўшчыне і Жыткаўчыне парушаны чалавекам прыроднае асяроддзе, якое было тысячу гадоў назад, у найменшай ступені знішчана схаваная ў зямлі памяць аб мінулым — археалагічныя помнікі. Невыпадкова тут дагэтуль адчуваецца водар дахрысціянскага і хрысціянскага часоў. Гэтая зямля густа насычана археалагічнымі скарбамі і мае выключнае значэнне для высвятлення перадгісторыі славянства, яго складання і ранняй гісторыі ўсходніх славян, важнае значэнне для даследавання гісторыі Беларусі.

Наўрад ці дзе яшчэ знойдзеш падобныя на тураўскія лодкі!

На паўночна-усходняй ускраіне гарадка, дзе шырокія лугі і старыя рэчышчы Прыпяці, якая вясною моцна разліваецца, можна і цяпер пабачыць тураўскую флатылію – розных памераў драўляныя лодкі. Майстэрства іх вырабу тураўлянамі перадаецца з пакалення ў пакаленне. Некалі тут будавалі не толькі вялікія і малыя лодкі, але і буйныя судны: парусныя берліны грузападымальнасцю да шаснаццаці тон і баркі, якія бралі на борт да сямі і больш тон. Была тут

у павазе яшчэ некалькі дзесятак гадоў таму і шугалея — вялікая лодка, што выраблялася з цэлага дубовага ствала. Цяпер тураўскія лодкі пераважна зроблены з драўляных дашчатых дошак, сярэдні памер іх каля пяці метраў. Тураўскія чоўны выдатна ходзяць як на вёслах, так і з маторам. Прыязджайце, пакатайцеся па прыгажуні-Прыпяці! Толькі тут вы знойдзеце казачныя прыпяцкія далі. Кожнага захопіць своеасаблівасць прыродных комплексаў, багацце флоры і фауны, веснавыя разлівы Прыпяці. Мне здаецца, толькі тут.







Гомельское отделение ОО «Союз писателей Беларуси» плодотворно сотрудничает с рядом литобъединений области. В их числе и литературный клуб «Родники», который был создан в 2000 году при ДК «Гомсельмаш». Его руководителем была избрана Людмила Ивановна Пакуленко. С 2012 года её преемницей стала Гузенкова Галина Ильинична.

Встречи с жителями микрорайона, выступления перед учащимися и студентами, выступления по радио, проведение литературно-музыкальных вечеров, занятия литературной школы, участие в литературных конкурсах — вот далеко не полный перечень мероприятий «родниковцев». За три последних года члены клуба издали ряд поэтических сборников: «Талый воск» и «Белая ворона» (С. Аронов), «Диалог» (Л. Пакуленко), «Нить Ариадны» (Е. Чернова), «Азбука озарения» (Г. Радионова), «З чыстай крыніцы», «Подари мне, мама, радугу» (Г. Гузенкова). На слова «родниковцев» гомельские композиторы написали несколько песен. Редакционный совет «Літаратурнай Гомельшчыны» предлагает познакомиться с творчеством активистов литературного клуба.

